№ 38 (683) 13 кастрычніка 2010

www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**Уклады: забіраць ці не?**

Старонка 5



**У Кручынскага нават мянушка была: Ферары**

Старонка 6



**Відэарадары выйшлі на паляванне**

Старонка 15

**Выбар-2010**

- **«Падпішыцеся за Аляксандра Рыгоравіча і атрымаеце буську!»** Захапляльнае відовішча: пікеты на вуліцах Мінска.
**Старонка 2.**

- **Насельніцтва плаціць 32% за камунальныя?** Не дурыце! На справе мы плацім нашмат больш.
**Старонка 4.**

- **Дзмітрый Ус: Сям'я баіцца, што мяне заб'юць.** Але мая мэта — даказаць фальсіфікацыі.
- **Гайдукевіч: Не хачу ўдзельнічаць у гэтым спектаклі.** Што б гэта значыла?
- **Як я перахітрыў лукашэнкаўцаў.** Прыходжу на працу — да мяне падскоквае намеснік дырэктара...
**Старонка 8.**

- **«У гасцях у кандыдата»:** Уладзімір Някляеў.
**Старонка 9.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# Цень Шэймана

Генерал уключаецца ў выбарчую кампанію.



8 кастрычніка Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчу з кіраўніком свайго перадвыбарчага штаба Аляксандрам Радзьковым. Так і перадалі ў навінах на тэлеканалах. Але ў кабінеце сядзеў і трэці чалавек — Віктар Шэйман.

Радзькоў сядзеў ад Лукашэнкі праваруч, а Шэйман — па левую руку. Кіраўніка дзяржавы паказвалі буйным планам, калі той звяртаўся да Радзькова, прапаноўваючы спыніць збор подпісаў. Старшыня «Белай Русі» пераконваў, што выбары праходзяць вельмі дэмакратычна. Зборшчыкі подпісаў стаяць усе разам, кансультуюцца паміж сабой.

Практычна ў гэтыя самы момант было добра бачна, што збоку нехта перабірае свае паперы. Гэта быў Шэйман. Нібыта і размова наўпрост яго не тычылася, але злавесная прысутнасць Шэймана ўсё адно адчувалася.

Яго цень можа ствараць нейкі новы кантэкст для выбараў. Напрыклад, у задачу Радзькова было пастаўлена правесці такія выбары, каб Захад не мог прычапіцца да іх легітымнасці, ствараць прыгожую карцінку. Пакуль у Радзькова ўсё ідзе па плане.

Але прысутнасць Шэймана можа намякаць краіне, што, калі адбудзецца нейкі збой і трэба будзе тэрмінова ратаваць сітуацыю, на дапамогу Лукашэнку прыйдзе яго даўні паплечнік. Для Шэймана такая праца не ў навіну. Гэта значыць, вернуцца рэпрэсіі і запалохванне.

Колькі ўжо было размоваў, што з Шэйманам і ягонай камандай пакончана. Дзе там! За два гады, што прайшлі ад часу адстаўкі, Шэйман захаваў вагу і ўплыў.

Прысутнасць на нарадзе па выбарах сведчыць, што Шэйман не пакідаў бліжэйшага атачэння Лукашэнкі.

**Зміцер Панкавец**

# «Хросны бацька — 4»: сенсацыйныя сведчанні

Новая частка атрымала назву «Апошняя восень».

Расійскі тэлеканал НТВ працягнуў паказ серыяла «Хросны бацька». Чацвёртая частка, што выйшла на экраны 11 кастрычніка, атрымала красамоўную назву «Апошняя восень».

**Паўлючэнка: Я ўпэўнены, што гэта забойства**

Чарговая серыя фільма выклікала меншы эфект, чым папярэднія. Людзі ўжо паспелі звыкнуцца да такога роду прадукцыі. Хоць цікавыя і нават сенсацыйныя факты былі агучаныя і ў гэтай частцы.

Звяртае на сябе ўвагу, што «Хросны бацька — 4» выйшаў адразу пасля чарговай сутычкі беларускага і расійскага кіраўніцтва. Гэта значыць, што ён быў падрыхтаваны загадзя.

Фільм пачынаецца з расказу пра загадкавую смерць журналіста Алега Бябеніна. Сябар памерлага Фёдар Паўлючэнка кажа: «Я ўпэўнены, што гэта забойства. Упэўнены, што гэта палітычнае забойства. Гэта найлепшы метад запалохаць грамадства».

**Лявонаў: «Пачакайце, усё яшчэ наперадзе»**

Выплывае ў фільме былы міністр сельскай гаспадаркі і палітвязень Васіль Лявонаў. Цяпер ён жыве ў Маскве. Ёсць меркаванні, што Лявонаў можа ў нейкай ступені фінансаваць частку апазіцыі. Ці, прынамсі, ён спрычыніўся да гэтага фінансавання.

Ужо першая фраза Лявонава гучыць інтрыгуюча: «Пачакайце, усё яшчэ наперадзе. Я ведаю тое, чаго яшчэ ніхто не ведае».

З вуснаў Лявонава гучыць гісторыя пра тое, як Лукашэнка трапіў у палітыку. Маўляў, яшчэ будучы дырэктарам саўгаса, ён збіў механізатара. Была заведзеная крымінальная справа і, каб не трапіць у турму, Лукашэнка пайшоў у дэпутаты Вярхоўнага Савета.

«Цяпер Лукашэнка — прэзідэнт. У падначаленых у яго цэлая краіна. А стыль камунікацыі застаўся ранейшым. Калі ў дырэктара калгаса здаюць нервы, то ў ход ідуць боты», — кажа закадравы голас.

**Някляеў: «Лукашэнка атрымаў накдаўн»**

Як і ў частцы трэцяй, адным з герояў зноў выступае лідар кампаніі «Гавары праўду» Уладзімір Някляеў. Гэтым разам ён не ездзіў для здымак у Маскву і апрануты быў у строгі касцюм.

Някляеў кажа, што ўсіх ягоных сяброў, спрэс да школьных, дапытваюць, ці не ведаюць яны чаго кепскага пра кандыдата ў прэзідэнты. «Гэта жахліва!» — кажа У.Някляеў.

**Працяг на старонцы 3.**

# Гонка за подпісамі

Захапляльнае відовішча: пікеты кандыдатаў на вуліцах Мінска.

«Дзе тут пікеты пачынаюцца? — запытваецца мужчына каля Камароўскага рынку. — Я б хацеў падпісацца за ўсіх». Такое меркаванне самае распаўсюджанае на гэтых выбарах.

Большасць спачатку вызначаецца, за каго не хоча падпісвацца, а далей ідзе з пашпартам па чарзе ад аднаго зборшчыка подпісаў да другога.

Зрэдку сустракаюцца тыя, хто шукаў менавіта свайго кандыдата. Напрыклад, каля пікета Рымашэўскага спыняецца сталая жанчына, яна шукала хрысціянскага дэмакрата. «Там, дзе Хрыстос, — там парадак, там будзе мудрасць». Пакуль жанчына ставіла подпіс, каля пікета пачаліся сапраўдныя «дэбаты».

«Я за Лукашэнку, бо я пенсіянерка, я буду мець кавалак хлеба заўсёды, а гэтыя свае зады панабіваюць і збягуць з чамаданамі», — вельмі апантана даказвала бабуля.

«А я хачу зменаў! Я за яго ні разу не галасавала. Тады ўжо бачыла, што за чалавек. — адказвала іншая жанчына, пакуль даставала пашпарт з сумкі. — Ён нас прывядзе да катастрофы. Даўгоў набраў 25 мільярдаў!»

Бліжэй да метро стаіць пікет Партыі БНФ. Людзі прызнаюцца, што проста не могуць прайсці міма бел-чырвона-белага сцяга, дастаюць пашпарты і ставяць подпіс. Жанчына з рэдкім імем Сталіна здзівіла нават сябра ініцыятыўнай групы. Акрамя кандыдата ад БНФ, Сталіна хоча распісацца і за Лукашэнку. Бо мы ж добра жывём у параўнанні з Расеяй. А за Кастусёва яна падпісалася, бо спадабалася біяграфія.

Акрамя сцяга, да пікета Кастусёва прыцягваў людзей Мілінкевіч. Яго пазнавалі і распытвалі, чаму ж ён сам не ідзе ў кандыдаты.

«Мы на Плошчу хадзілі за Вас. А Вы!..» — з дакорам прамаўляе жанчына. Мілінкевіч апраўдваўся. Казаў, што трэба пачакаць свабодных выбараў, што ён не сыходзіць з палітыкі. Добра, маўляў, што ў кандыдаты ідзе моладзь.

Сябар ініцыятыўнай групы Кастусёва Сяржук Семянюк кажа, што яны ў пікеце штодзень збіраюць прыблізна 70—100 подпісаў. Сам перад сабой Сяржук паставіў асабістую планку — агулам сабраць дзве тысячы подпісаў. Пакуль што ён ідзе з апераджэннем уласнага графіка, людзі падпісваюцца ахвотна. Лепей, чым у 2006-м, зазначае Сяржук.

Тое самае адзначае і сябар ініцыятыўнай групы Саннікава. «Можна сабраць у разы 2—3 болей подпісаў, чым за Мілінкевіча, — кажа Яўген Бабковіч. — На мінулых выбарах людзі былі вельмі запалоханыя. Цяпер ці то людзей дастала, ці то насамрэч у Беларусі лібералізацыя. Людзі не баяцца! Але тады ўсё было інакш, а сёлета многа розных кандыдатаў».



Юлія Дарашкевіч

Паводле ягоных словаў, кожны пікет Саннікава за дзень набірае 150—200 подпісаў.

Прыблізна тыя самыя лічбы называе і Павал Знавец, сябар ініцыятыўнай групы Раманчука.

Мужчына з вуліцы чуе нашу размову і просіць перадаць кандыдатам: «Ім трэба аб'яднацца! Саннікаў — прэзідэнт, бо ён юрыст. Раманчук — прэм'ер-міністр, а Някляеў — па ідэалогіі і па культуры. Во будзе каманда!»

Каля ўнiверсама «Цэнтральны» ў гэты час побач размясціліся два пікеты: Някляева і Лукашэнкі. Паміж сабою сябры ініцыятыўных групаў не сварацца.

Настаўніца школы №21 Святлана Зыбіна кажа, што збірае подпісы і падтрымлівае Аляксандра Рыгоравіча, бо мае вышэйшую адукацыю, працу, кватэру і вельмі ўдзячная прэзідэнту за ўсё гэта.

«Падпішыцеся за Аляксандра Рыгоравіча і атрымаеце буську!» — заклікае ў гэты час яе калега з ініцыятыўнай групы прэзідэнта.

Людзі абыходзяць дзівачку, і някляеўцы кпяць: «Што ж толькі буську, чаму так мала?»

Але вось падышла падпісацца і за Лукашэнку маладая дзяўчына: «Нічога дрэннага ён нам не зрабіў. Чаму не? Яго праграму на гэтых выбарах я не чытала, але думаю, горш, чым ёсць, ужо не стане».

Людзі ахвотна падпісваюцца і за Міхалевіча, і за Глушакова. Увогуле, за ўсіх падпісваюцца, бо пікеты — вясёлае і пазітыўнае месца. За адзін дзень побач са зборшчыкамі подпісаў давялося і вершаў паслухаць, і пачуць ад мужчыны, як вароны крумкаюць, і нават паўдзельнічаць самой у абмеркаванні кандыдатаў. Цяжка стрымацца, калі ідзе такая актыўная кампанія. Пасля пятнаццаці гадоў забароны ў краіне — свабода палітычнай агітацыі.

**Настасся Шамрэй**

КАМЕНТАР

## Лукашэнкаўцы згортваюць збор подпісаў, бо пікеты пустуюць?

Чаму Аляксандр Лукашэнка распарадзіўся спыніць збор подпісаў у сваю падтрымку? Гэта, мякка кажучы, неардынарны крок. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, яго каманда ўжо сабрала 600 тысяч подпісаў.

Але па пікетах таго не сказаў бы. Ля столікаў, дзе прапаноўвалі паставіць аўтограф за Лукашэнку, ажыятажу не назіралася. Нашмат больш выбаршчыкаў збіралася каля столікаў апазіцыйных дзеячаў. Да такой высновы мог прыйсці кожны, хто мае вочы. Часамі там нават чэргі выстройваюцца.

Не выключана, што лукашэнкаўцы спыняюць збор подпісаў на вуліцах, каб прыхаваць нявыгадную для сябе рэальнасць. Яны ўпэўненыя, што за Лукашэнку назбіраецца дастатковая лічба подпісаў на прадпрыемствах. Імаверна, гэтая лічба будзе не меншай за мільён, каб народная падтрымка выглядала салiднай.

**Андрэй Дынько**

## Сцісла

• **Украіна пераключыць «Адэса—Броды» ўжо ў лістападзе.** На спробу. Так ажыццявіцца выпрабавальная прапампоўка 80 тысяч тон венесуэльскай нафты на Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод. Міністр паліва і энергетыкі Украіны Юрый Бойка спаслаўся на пратакольнае рашэнне ўрада. Цяпер нафтаправод «Адэса—Брады» працуе ў рэверсным рэжыме ў накірунку Адэсы. Венесуэльская нафта пастаўляецца ва Украіну танкерамі па моры, а ў Беларусь едзе чыгункай.

• **«Белсат» пакажа ролікі ўсіх кандыдатаў.** Ролікі працягласцю 2—3 хвіліны распавядуць пра біяграфіі, асабістае жыццё і тэзісы праграмаў прэтэндэнтаў. Ролікі будуць паказвацца з 12 да 26 кастрычніка. Прычым у найлепшы эфірны час – пасля інфармацыйнай праграмы «Аб'ектыў» ў 17.05 і 21.25.

• **Мінская дзевяцікласніца выкінулася з 19-га паверха.** Трагедыя адбылася 11 кастрычніка каля 21.30 на вуліцы Матусевіча. Чатырма гадзінамі раней у Заводскім раёне скончыў жыццё самагубствам 23-гадовы юнак. Яго знайшлі ў пятлі на балконе яго кватэры. Малады чалавек прыйшоў дахаты і, нічога не тлумачачы, выйшаў на балкон і павесіўся. У гэты час у кватэры знаходзіліся сваякі.

• **Школе №114 Мінска прысвоена імя Сімона Балівара.** На цырымоніі ў школе на вуліцы Сядых прысутнічалі пасол Венесуэлы Амерыка Дыяс Нуньес і намеснік старшыні гарвыканкама Міхаіл Ціцянкоў. У школе паставілі бюст Балівара.

• **Леанід Кучук вярнуўся ў «Шэрыф».** Гэтым разам — на пасаду спартыўнага дырэктара. У студзені гэтага года ён пакінуў пасаду галоўнага трэнера пасля шасці гадоў супрацоўніцтва. «Шэрыф» — супернік барысаўскага БАТЭ па групавым турніры Лігі Еўропы. Цяпер яго трэніруе беларускі спецыяліст Андрэй Сасніцкі. Матч «Шэрыф»—БАТЭ пройдзе 21 кастрычніка ў Ціраспалі, 4 лістапада каманды згуляюць у Мінску. Пасля 2-х тураў: БАТЭ — 4, «Шэрыф», AZ — 3, «Дынама» Кіеў —3.

• **Кастрычнік чакаецца даволі цёплы, у межах нормы.** У бліжэйшыя два тыдні маразоў не прагназуецца.

**МБ; ЯВ; БелаПАН**

### Самае чытанае на nn.by за 7—12 кастрычніка

- «Хросны бацька–4»: сенсацыйныя сведчанні
- Гонка за подпісамі. Захапляльнае відэа пра настроі мінскай вуліцы
- Матацыклісту ў аварыі на праспекце адарвала галаву
- Студэнткі МГУ зняліся для Пуціна напаўаголенымі
- Фотафакт: Патрыятычныя трусы
- Як у Мінску Жырыноўскага білі
- Андрэй Саннікаў: Мы моцныя
- Франак Вячорка: Патрэбны любыя перамены
- БНФавец?! А ён табе трэба?
- Пакуль Радзькоў заняты выбарамі, КДК заняўся Радзьковым

## Моладзь заваявала пуцёўку на чэмпіянат Еўропы

У аўторак у Барысаве падапечныя Георгія Кандрацьева разграмілі Італію з лікам 3:0. У першым матчы ў Італіі маладзевая зборная Беларусі па футболе прайграла 0:2 і мала хто верыў, што нашы выйдуць пераможцамі двубою. А яны ўзялі — і перамаглі. Ужо на 4 і 5-й хвіліне Уладзімір Юрчанка («Дняпро» Магілёў) забіў два галы. Асноўны лік так і скончыўся 2:0. А ў пачатку авертайма мінскі дынамавец Алег Вераціла (96-я хвіліна) забіў пераможны для нас гол. Першынство пройдзе з 12 па 25 чэрвеня 2011 года ў Даніі.

**Алег Гардзіенка**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз!

### Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты (змяніліся з 1 мая):**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Аддз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

### Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце.

### Дзякуй падпісчыкам,

якія падпісваюцца праз Рэдакцыю

Віталю Б. з Полацкага раёна.
Анатолю І. з Мастоўскага раёна.
А.Г. з Бабруйскага раёна.
Людміле П., А.А. з Іўеўскага раёна.
Г.К., Н.Ж., В.К., Н.Ж. з Гродна.
Галіне Ю., Антону Б. з Верхнядзвінскага раёна.
В.В. са Стаўбцоўскага раёна.
Уладзіміру Л. з Маладзечанскага раёна.
Віктару К. з Рэчыцкага раёна.
Івану Д. з Мядзельскага раёна.
Мікалаю В. з Бярозаўскага раёна.

# «Хросны бацька — 4»: сенсацыйныя сведчанні

Працяг са старонкі 1.

Дарэчы, яму належыць і апошняе слова ў фільме. «Пасля змены адносін паміж Расіяй і Беларуссю Лукашэнка стаў мне нагадваць баксёра на рынгу пасля накдаўна. Ён яшчэ рухаецца, яшчэ заўзятары крычаць: «Левай бі! Правай давай!» Ён падныравае, ухіляецца... але за галаву ўжо не адказвае. І толькі суддзя можа заўважыць, што яго час з рынга зняць. Дзеля яго ўласных інтарэсаў, дзеля яго ўласнай бяспекі», — кажа У.Някляеў.

### Алкаеў: Паўлічэнка спалохаўся

Робіцца чарговы экскурс у таямнічыя знікненні і смерці апазіцыйных палітыкаў дзесяцігадовай даўніны.

Былы начальнік мінскага СІЗА Алег Алкаеў расказвае пра тое, што тагачасны начальнік СОБРа Дзмітры Паўлічэнка аднойчы асабіста захацеў папрысутнічаць пры расстрэле асуджанага.

«Калі прагучаў выстрал, то ён адскокнуў убок і спалохаўся. Твар ён закрыў рукамі».

### Новічак: Нам казалі, што гэта дзеянні на карысць прэзідэнта

Найбольш цікавым у фільме выглядае з'яўленне Дзмітрыя Новічка. Гэта былы салдат вайсковай часці 3214. Той самай, якой некалі кіраваў Дзмітры Паўлічэнка.

Новічак кажа, што ў СОБР яго рэкамендаваў маёр Васільеў, намеснік Паўлічэнкі па спартовай падрыхтоўцы. Новічак быў сябрам Васільева і ў асабістых размовах, сцвярджаюць тэлевізійнікі, прызнаваўся, што прымаў удзел у выкраданнях Захаранкі, Ганчара, Красоўскага і Завадскага.

«Усё гэта сапраўды было, але пад іншым соусам. Калі апазіцыя падае гэта як бандытызм, злачынствы, то нам падавалася як выкананне спецаперацыі. Дзеянне на карысць прэзідэнта, краіны», — кажа Д.Новічак.

Ён расказвае, што аднойчы Паўлічэнка сказаў фразу, каб не дапускалі «памылак, якія былі дапушчаныя з Ганчаром і Красоўскім».

### Паганяйла: Васільева не расстралялі, бо ён абяцаў маўчаць

Паводле аўтараў фільма, аднойчы Паўлічэнка падышоў да Новічка і паведаміў, што маёр Васільеў арыштаваны за забойства жанчыны, і прапанаваў даць паказанні супраць яго. Але баец адмовіўся, бо быў перакананы, што Васільеў нічога не здзейсніў.

У выніку сам Новічак апынуўся ў турме. Аднойчы падчас прагулкі па турэмным дворыку ён сустрэў маёра Васільева. Той сказаў, што «яго падставілі за дачыненне да знікненняў Завадскага і іншых». Афіцыйна ж Васільеў быў асуджаны за забойства Лілії Сайко. Гэтая жанчына была знаёмай Валерыя Ігнатовіча, асуджанага па справе Зміцера Завадскага. У Ігнатовіча знайшлі ўпрыгожванні Сайко, але палічылі гэта недастатковым для пакарання.

Праваабаронца Гары Паганяйла лічыць, што Васільеў не быў расстраляны толькі таму, што абяцаў маўчаць пра вядомае яму і што ён пакінуў гэтыя матэрыялы ў кагосьці. Дзе цяпер знаходзіцца маёр, ніхто не ведае. Дзе здымалі Новічка, таксама невядома.




**Былы баец СОБРа: «Усё гэта сапраўды было».**

**Зміцер Панкавец**

# Сідарэвіч на чале сацыял-дэмакратаў

У кіраўніцтва партыі абрана таксама шмат моладзі.

70 чалавек сабраліся на з'езд Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада). Ён праходзіў 10 кастрычніка ў Сядзібе БНФ.

Цікава, што напярэдадні сходу ў газеце Адміністрацыі прэзідэнта «Советская Белоруссия» выйшла інтэрв'ю з дзейсным старшынёй арганізацыі Анатолем Ляўковічам. У гутарцы з Вячаславам Оргішам Ляўковіч зноў пахваліў сённяшняга кіраўніка краіны. Нават з перамогай на выбарах паспеў павіншаваць. Дэлегаты актыўна чыталі дадзены матэрыял.

Зрэшты, здавалася, Ляўковіч вырашыў за крэсла не трымацца. Сказаў, што больш балатавацца на пасаду старшыні не будзе. Прапаноўвалі яму месца намесніка ці хаця б у Цэнтральным камітэце партыі. «Не, — цвёрда адрэзаў Ляўковіч, — буду шараговым партыйцам».

На месца пераемніка вылучыліся тры кандыдаты. Гісторык, літаратуразнаўца, адзін з ветэранаў незалежніцкага руху Анатоль Сідарэвіч прадстаўляў прабеларускія сілы. А вось генерал Валеры Фралоў, хутчэй, — прарасійскія. Добра памятаецца, як Фралоў на пару з Сяргеем Скрабцом ладзіў акцыі на Бангалоры ў падтрымку саюза з Расіяй. Трэцім кандыдатам стаў прадпрымальнік з Узды Віктар Крываль.

Побач з ужо вядомымі партыйцамі (Алег Трусаў, Мечыслаў Грыб, Міхась Чарняўскі) на з'ездзе было дастаткова шмат і моладзі. Прычым, амаль з усіх рэгіёнаў.

Выбары старшыні адбываліся шляхам тайнага галасавання. Прычым, галасавалі не толькі «за» пэўнага кандыдата, але і «супраць». У выніку за кандыдатуру А.Сідарэвіча прагаласавалі 35 чалавек (супраць — 33), за Фралова — 10 (супраць — 57), за Крывала — 7 (супраць — 61). Такім чынам, Сідарэвіч набраў роўна на адзін голас больш, чым было патрэбна.

Алег Трусаў, віншуючы сп. Сідарэвіча з абраннем на пасаду, зазначыў: «Раю падчас старшынства забыцца на свой кепскі характар». Трусаў зазначыў, што, нягледзячы на свае перманентныя канфлікты з Сідарэвічам, галасаваў за яго, каб ратаваць партыю.

Здавалася б, вось і новы старшыня абраны, але на гэтым жарсці толькі пачаліся. Ляўковіч ускочыў з месца і пачаў гаварыць, што не прызнае легетымнасць з'езда, бо Сідарэвіч быў выключаны з партыі. Ён забраў свае манаткі і вылецеў з залы, абяцаючы звярнуцца ў Мінюст.

Зрэшты, далёка старшыня былы не адышоў. Бо калі абвясцілі перапынак, Ляўковіч размаўляў з Грыбам, Трусавым і астатнімі. Тыя ўгаворвалі Ляўковіча не займацца абы-чым.

Сідарэвіч кажа, што цяпер перад ім стаіць шмат арганізацыйнай працы. Найперш, каб наняць офіс для цэнтральнай арганізацыі, паскорыць рэгістрацыю некаторым рэгіянальным структурам.

Новы старшыня зазначыў, што трымацца пасады не будзе. «Мая справа — выхаваць новае пакаленне. Я заўсёды казаў, што буду апошнім старшынёй, які не размаўляе па-англійску», — сказаў ён.

Ну і дзеля справядлівасці скажам, што абнавіць партыйныя шэрагі ўдалося. Намеснікамі старшыні сталі 25-гадовая Вольга Тыгрыцкая і 28-гадовы Ігар Барысаў, а таксама Ірына Вештард. Першым намеснікам стаў Ігар Маслоўскі з Брэста.

Што да выбараў, то ніякіх заяваў не прымалі. Партыйнага кандыдата няма, як і ў 2006 годзе, таму кожны працуе на таго, хто больш даспадобы.

**ЗП**

**Анатоль Сідарэвіч**

Нар. у 1948 у вёсцы Задуб'е Ганцавіцкага раёна. У 1977 скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт. Працаваў у газеце «Літаратура і мастацтва», часопісе «Крыніца». Даследуе гісторыю беларускага руху XX стагоддзя. Адзін з ініцыятараў адраджэння сацыял–дэмакратычнага руху ў Беларусі ў найноўшы час. Аўтар кнігі «Пра Івана Луцкевіча: успаміны, сведчанні» і шматлікіх навуковых прац і артыкулаў. Жыве ў Мінску.

# Лукашэнка разлічвае на кітайскія мільярды

Аляксандр Лукашэнка знаходзіўся з візітам у Кітаі. У Пекіне кіраўнік Беларусі сустрэўся са старшынёй КНР Ху Цзіньтао. Быў падпісаны шэраг дакументаў па рэалізацыі беларуска-кітайскіх праектаў на 3,5 мільярда даляраў.

Лукашэнка падзякаваў Ху Цзіньтао «за вялікую дапамогу і падтрымку» і нагадаў, што гэта яго шостае наведванне Кітая.

Яшчэ напярэдадні візіту інфармацыйнае агенцтва «Сіньхуа» змясціла вялікае інтэрв'ю з Лукашэнкам.

«Самае ж галоўнае, што, інвестуючы ў беларускую эканоміку, Кітай ніколі не выстаўляе Беларусі ніякіх палітычных умоваў, а таму, паводле Лукашэнкі, Беларусь спадзяецца на далейшыя буйныя кітайскія інвестыцыі, прычым, больш хуткімі тэмпамі. Са свайго боку, Беларусь гатовая стварыць найлепшыя ўмовы для кітайскага бізнесу», — заявіў А.Лукашэнка.

Беларускі лідар сказаў, што ён вельмі любіць старажытную кітайскую культуру, асабліва храмавае будаўніцтва, а таму прапанаваў кітайскаму боку будаўніцтва China Town у Мінску.

Таксама Лукашэнка наведаў сусветную выставу «Экспа-2010» у Шанхаі.

**ЗП**

## Сцісла

• **«Дэзынфармацыя, што Беларусь згорне інтэграцыйныя праекты».** Пра гэта агенцтву «Інтэрфакс» заявіў кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей. «Гэта чарговая правакацыя ў дачыненні да Беларусі. Яны, на жаль, пачасціліся ў апошні час».

• **Дзяржаўма падтрымала Мядзведзева.** Адносіны Масквы і Мінска не павінны выкарыстоўвацца ў якасці разменнай манеты падчас перадвыбарнай кампаніі ў Беларусі — такая сутнасць заявы «Аб сітуацыі ў расійска-беларускіх адносінах», прынятай 6 кастрычніка Дзярждумай РФ. Беларуская палата прадстаўнікоў адказала прымірэнчай заявай.

• **Замест сына генерала Сухарэнкі ў Страсбург паехаў сын генерала Крывашэева.** Не так даўно разам з дарадцам прадстаўніцтва Беларусі пры Радзе Еўропы Андрэем Бушылам працаваў сын былога старшыні КДБ Сцяпана Сухарэнкі Андрэй. Адносна нядаўна Андрэй Сухарэнка вярнуўся ў Мінск — пайшоў на павышэнне. А ягонае месца заняў сын генерал-маёра Юрыя Крывашэева Дзмітрый.

**ЗП; «Народная воля»**

# Прыватны ЖЭС

**Канцэпцыя развіцця жыллёва-камунальнай гаспадаркі да 2015 года прадугледжвае, што большасць жыллёвага фонду будзе абслугоўвацца праз таварыствы ўласнікаў.**

Фактычна, ЖЭСы і ЖРЭА мусяць адмерці як рэлікт эпохі. Што прапануецца ўзамен? З таго, што існуе зараз, найбольшы інтарэс выклікаюць таварыствы ўласнікаў. Тое, што ў народзе называюць «прыватныя ЖЭСы».

Што гэта такое і якія ёсць плюсы і мінусы ў гэтай з'явы, «Нашай Ніве» расказаў галоўны інжынер аднаго з самых паспяховых мінскіх таварыстваў уласнікаў «Агмень» Генадзь Калёнаў. Яго вотчына знаходзіцца ў сталіцы па адрасе Лагойскі тракт, 19/4. Калісьці дом быў праблемным, бо будаўнікі здалі яго з шматлікімі недаробкамі. Гэта было ў 2003 годзе, недахопы прыйшлося выпраўляць уласнаручна, а праз некалькі гадоў «Агмень» дамогся кампенсацыі ў несумленных будаўнікоў.

Цяпер дом можна назваць узорна-паказальным. Пад'езды чысцюткія, а ў двары пасаджаныя кветкі з Батанічнага сада. Садоўнікі падстрыгаюць кусты, на паркоўцы нанесена разметка... Не хапае толькі афіцыйных замежных дэлегацый, каб паказаць дбанне беларусаў пра сваё жыллё.

І ўсё гэта — дзякуючы фактычнай незалежнасці ад дзяржаўных жыллёва-эксплуатацыйных структур.

«З бюджэту мы не ўзялі ніводнай капейкі», — падкрэслівае Генадзь Калёнаў.

### Хмарачос нароўні з драўлянай халупай

«Закон аб сумесным домаўладанні прадугледжвае некалькі варыянтаў: напрыклад, гэта непасрэднае кіраванне (да 5 кватэр) без стварэння юрыдычнай асобы, таварыства ўласнікаў. Згодна з заканадаўствам, калі ж грамадзяне не самаарганізоўваюцца, іх далучаюць да ЖРЭА адпаведнага раёна. Фактычна ім прызначаецца ўпаўнаважаны ў асобе дырэктара ЖРЭА, — расказвае ён цяперашнюю сітуацыю. — Нядаўна Адміністрацыя прэзідэнта праводзіла маніторынг грамадскага меркавання. Высветлілася, што 40% скаргаў насельніцтва адносяцца да сферы ЖКГ. Людзі выказаліся, што гэта насамрэч вялікая праблема. Але яны не хочуць удзельнічаць у мерапрыемствах па змене сваіх умоў, стварэнні асацыяцый ці таварыстваў уласнікаў. Яны чакаюць, што нехта за іх зробіць».



ЯГОР МАРЦІНОВІЧ

Праект «Жыллёвыя рэформы з удзелам насельніцтва» рэалізуецца ў Беларусі пры падтрымцы Еўрасаюза. Хоць яго тэрмін дзеяння скончаецца ў снежні 2010 года, спробы папулярызацыі таварыства ўласнікаў можна лічыць паспяховымі. Большасць навабудаў, якія здаюцца ў Мінску, адразу ж арганізоўваюць сваю структуру, не звяртаючыся да ЖРЭА.

«Усе дамы ў Беларусі розныя. Параўнайце: пасёлак гарадскога тыпу, пяціпавярховік, ліфта няма, дваровай тэрыторыі фактычна няма, лавачак няма. І хмарачос у цэнтры Мінска: падземны гараж, пяць ліфтаў, сістэма дымавыдалення, пажарагашэння, дыстанцыйнага кіравання лічыльнікамі... — разважае Генадзь Калёнаў. — Ці могуць быць затраты на эксплуатацыю першага і другога дома аднолькавымі? Ніколі! Але тарыфы ўсталёўваюцца пастановай Савета міністраў аднолькавыя для ўсёй тэрыторыі Беларусі. Гэта не эканоміка».

З гэтага вынікае і адзін з недахопаў таварыстваў уласнікаў. Стварыць акупляльную структуру ў «сталінцы» ці «хрушчоўцы» амаль нерэальна, бо амаль усе памяшканні патрабуюць капітальнага рамонту. Прычым адлічэнні на рамонт выплачваліся ЖЭСу дзесяцігоддзямі. Дык што, пакінуць тыя грошы дзяржаве і скідваца па-новаму? Рытарычнае пытанне.

### Справаздача ад ЖЭСа стане рэальнасцю

«Каб развіваліся рынкавыя адносіны ў кіраванні жылым фондам, павінны існаваць дзве ўмовы, — працягвае Генадзь Калёнаў. — Па-першае, гэта канкурэнцыя. Спадзяюся, яна з'явіцца ў бліжэйшыя гады. А вось другая — празрыстасць і адкрытасць. У новым Жыллёвым кодэксе, які парламент збіраецца прымаць у бліжэйшы час у першым чытанні, прапісаная яшчэ адна форма домаўладання — «праз арганізацыю». Гэта зроблена па нямецкім прынцыпе.

Нават калі гэта будзе ЖЭС, у канцы кожнага фінансавага года ён будзе павінен прадаставіць справаздачу. Пакуль што гэта не прадугледжваецца. А вось таварыства ўласнікаў абавязанае прадастаўляць справаздачу штогод ужо цяпер.

Напрыклад, па выніках восеньскага прагляду дома складаецца фінансавы план на наступны год, і ў студзені кожны жыхар дома атрымлівае справаздачу за папярэдні год і план наступнага. У дакуменце — абсалютна ўсе банкаўскія плацяжы за год па месяцах».

Падсправаздачны ЖЭС — нешта падобнае на казку. Куды цякуць грошы «тэхнічнага абслугоўвання», цікава кожнаму жыльцу дома.

### Даражэйшае, але і прыгажэйшае

І ўсё ж галоўнае пытанне, якое паўстае перад тымі, хто вагаецца паміж ЖРЭА і таварыствам уласнікаў, ці адрозніваецца кватрплата? Большая ці меншая, чым у ЖЭСе? «Як калі, — кажа Генадзь Калёнаў. — Гэта ж самакіраванне. Калі агульны сход прыме рашэнне трымацца тарыфаў Саўміна, кватрплата будзе такой самай, як у ЖЭСах. Напрыклад, існуе асацыяцыя «Юнацтва. Орша». Невялікі горад з адпаведнымі заробкамі, праблемы з беспрацоўем... Мэта арганізацыі — паменшыць страты. І яны выкарыстоўваюць дзяржаўныя тарыфы, але замена сантэхнікі ў іх, у адрозненне ад ЖЭСаў, бясплатная. Тэрыторыя агароджаная, відэаназіранне, але яны ўкладваюцца ў гэтыя тарыфы. Яны аказваюць нашмат больш паслуг за тыя ж грошы і аказваюцца ў плюсе. У сталіцы ж даходы ў насельніцтва большыя, але і запыты большыя, таму мінчукі згодныя плаціць больш. У «Агмені» тарыфы большыя, чым у дзяржавы, але таварыства не атрымлівае датацый. Прыходзіць рахунак ад пастаўшчыка паслугі і дзеліцца на ўсіх у залежнасці ад долі. Ніякіх нармаваных-ненармаваных метраў, прапіскі ці рэгістрацыі... Нас гэта не хвалюе».

Праўда, яшчэ адзін радок стратаў для таварыстваў уласнікаў — першасны ўзнос. У некаторых навабудах Мінска ён дасягае 18 мільёнаў рублёў. Гэта $6 тысяч! Зарплата бухгалтару і дырэктару, абсталяванне, рэзервовы фонд арганізацыі... — прыдумаць прычыну, пад якую варта сабраць грошы, нескладана. Вось толькі ці акажацца часовы дырэктар зацікаўлены ў тым, каб захаваць і памножыць гэтыя грошы, а не пакінуць рэшту ад «адкату» сабе ў кішэні.

Насамрэч крытычных водгукаў пра таварыствы хапае. Часам кампанія-забудоўшчык фактычна праштурхоўвае на выбарах у дырэктары сваіх кандыдатаў, якія па сумяшчальніцтве «ўзначальваюць» яшчэ два-тры дамы. Дый паскардзіцца на кіраўніцтва складана. Калі, змагаючыся з ЖРЭА ці ЖЭСам, можна дайсці хоць да Адміністрацыі прэзідэнта, то з недзяржаўнымі структурамі складаней. Часам урэшце жыльцы плююць на жыллёвую незалежнасць і звязаную з ёй нявызначанасць і вяртаюцца да «роднага» ЖЭСа.

### Прыступка да прыходу прафесіяналаў

«Будучыня не за таварыствамі ўласнікаў, — падводзіць вынікі Генадзь Калёнаў. — З цягам часу прыйдуць прафесійныя прыватныя домакіраўнікі. Можна будзе абраць з 10—15 кампаній найлепшую. Як павінна быць у ідэале? Выбарны орган дома заключае дамову з пэўнай кампаніяй. Калі яе праца не задавальняе, дамова заключаецца з больш паспяховымі канкурэнтамі».

Ён рэальна ацэньвае сітуацыю і не з'яўляецца прыхільнікам таго, каб таварыствы ўласнікаў ахапілі ўсю краіну. Адзнаку ў 50% рынку можна лічыць своеасаблівым максімумам.

**Яўген Васількоў**

# Насельніцтва плаціць толькі 32%? Не дурыце людзей!

**Журналіст падлічыў: на справе мы плацім нашмат больш.**

Адзін з самых вядомых беларускіх блогераў журналіст Віталь Малішэўскі паспрабаваў зразумець, як вылічваецца «100%-ая аплата» дзяржаўных паслугаў, і ўпэўніўся: лічбы ўзятыя са столі.

«Так званая кватрплата ў насельніцтва 32%. 32% плаціць насельніцтва, а 68 — хто? Кампенсуе дзяржава! 68% мы плацім за насельніцтва па жыллёва-камунальных паслугах!» — гэта прэзідэнт бярэ на сябе мае выдаткі па «так званай кватрплаце». «У цяперашні час насельніцтва аплачвае менш за 30% выдаткаў на вытворчасць жыллёва-камунальных паслуг. Розніца кампенсуецца ў выглядзе субсідый і з бюджэту», — свежае ліпеньскае ўдакладненне ад намесніка міністра Мікалая Ліпеня.

Але няма такой паслугі, якую мы аплачваем ніжэй за 40%! Пачытаем разлікі «эканамічна абгрунтаваных стратаў».

Вось намеснік гендырэктара «Мінсктранса» Ірына Якубоўская тлумачыць, як дзяржава аплачвае стратны праезд у аўтобусе: «Калі быць дакладнай, узровень акупляльнасці за шэсць месяцаў 2009 года склаў 48,1%». Атрымліваецца амаль палова. Але — як ж словы! — каб гарадскі пасажырскі транспарт стаў акупляльным, «талончык (каштаваў тады 600 рублёў) павінен каштаваць прыкладна 1720 рублёў, гэта значыць у 2,9 разу вышэй». Праўда, цікавая матэматыка?

А вось начальнік кіравання дашкольнай адукацыі Міністэрства адукацыі Галіна Макаранкава здзіўляе, маўляў, «цалкам на знаходжанне дзіцяці ў садку, паводле дзяржаўных сацыяльных стандартаў, затрачваецца больш за 3 (!) мільёны рублёў штомесяц». А гэта ж разоў у пяць даражэй, чым каштуе навучанне студэнта ў БДУ! Калі зазірнуць у бюджэт, на дашкольную адукацыю ў 2009-м выдаткавалі 10,2 мільярда рублёў. На 366 тысяч дзяцей гэта ўсяго 28 тысяч рублёў на кожнага.

І ўсё — з нашых жа з вамі падаткаў.

**Паводле malishevsky.livejournal.com**

| Паслугі ЖКГ | Як аплачваем, (у рублях) | …і якія рэальныя страты | % |
|---|---|---|---|
| Ацяпленне (Гкал) | 43 458 | 86 894 | 50% |
| Вада | 385,7 | 860 | 44% |
| Падагрэў вады | 43 458 | 86 894 | 50% |
| Каналізацыя (кубаметр) | 242 | 684,3 | 35% |
| Газ | 462 ($154) | $180 (купляе краіна) | 86% |
| Тэхабслугоўванне (квадратны метр) | 296 | 622,5 | 47% |
| Вываз смецця (кубаметр) | 3 411 | 6 753 | 50% |
| Абясшкоджванне (кубаметр) | 1 353 | 2 678,5 | 50% |
| Электрычнасць (цэнты за кВт/г) | 173 за кВт/г (5,7 цэнтаў) | 5,63 (у 2009 г на электрастанцыях) | 101% |
| Ліфт (з чалавека) | 1 421 | 3 322 | 42% |

### Сцісла

• **Кітай наабяцаў Беларусі інвестыцый на $3,5 мільярда.** На кітайскія грошы пабудуюць завод па вытворчасці сульфатнай беленай цэлюлозы ў Светлагорску, дзве гідраэлектрастанцыі, гатэль у Мінску, пасажырскі тэрмінал і другую ўзлётную паласу ў аэрапорце «Мінск-2». Апроч таго, у Кітаі пачнуць збіраць БелАЗы.

• **Альтэрнатыўным маршрутам паставак нафты стане Літва.** Віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка дамовіўся, што ў бліжэйшыя два гады праз Клайпедскі порт будзе траспартавана не менш за 2,5 мільёна тон нафты. Літва зацікаўлена ў як мага больш доўгатэрміновым супрацоўніцтве, у той час як Беларусі хацелася б заключыць дамову на кароткі час.

**ЯВ**

# Уклады: забіраць ці не?

**Беларускую эканоміку падстрахуе МВФ.**

Кіраўніца «Беларусбанка» Надзея Ермакова паскардзілася журналістам, што людзі з панічнай масавасцю забіраюць з банка дэпазіты ў беларускіх рублях. Па яе словах, «фізічныя асобы здымаюць каля 5—7 мільярдаў рублёў штодзень». Гэта каля $2 мільёнаў.

Ермакова мяркуе, што адной з асноўных прычынаў адтоку рублёвых дэпазітаў насельніцтва стала інфармацыйная вайна ў дачыненні да Беларусі ў расійскіх СМІ.

Сенсацыйныя прызнанні банкіркі паспяшаліся абвергнуць у Нацбанку, прыкрываючы мінуламесячнай статыстыкай. Па словах прэс-сакратара ўстановы Анатоля Драздова, за верасень рублёвыя ўклады насельніцтва агулам выраслі на 81,5 мільярда рублёў. Гэта каля $27 мільёнаў у эквіваленце. За той самы час валютныя ўклады павялічыліся ажно ў шэсць разоў больш — на $180 мільёнаў!

«Адток укладаў назіраецца толькі ў «Беларусбанку», бо іншыя банкі прапануюць больш выгадныя прапановы», — заявіў Анатоль Драздоў. Сапраўды, трохмесячныя ўклады можна зрабіць толькі пад 14—15%, што менш, чым у канкурэнтаў. Але ніколі раней менш выгадныя ўмовы «Беларусбанка» не прымушалі беларусаў адмаўляцца ад яго паслугаў.

Дэвальвацыйныя чаканні не прыйшлі з ніадкуль. Хоць афіцыйная версія застаецца ранейшай — на канец 2011 года курс даляра складзе 3206 рублёў і ні рублём больш, — заробкі, якія зваліліся на галаву бюджэтнікам, не толькі радуюць іх, але і палохаюць. Заяўленыя 7% дэвальвацыі за год супраць 30% узнятых заробкаў — хто каго?

Экс-кіраўнік Нацбанка Станіслаў Багданкевіч не чакае абвалу ў банкаўскай сферы: «Калі ў «Беларусбанку» з'явяцца чэргі за ўкладамі — тады так, гэта небяспечна». Варта нагадаць, што менавіта Багданкевіч заяўляў за пару дзён да дэвальвацыі 2009 года, што раіць трымаць грошы ў банках.

Іншы эканаміст, Сяргей Чалы, па-ранейшаму ўпэўнены, што дэвальвацыя будзе, толькі не аднаразовая, а плаўная. «Усё нагадвае канец 2008 года, — заўважае ён. — Рэзкая дэвальвацыя наўрад ці адбудзецца, бо інакш давер да нацыянальнай валюты давядзецца вяртаць цягам доўгіх гадоў. Калі ж не чакаць рэзкага скачка, няма і неабходнасці тэрмінова пераводзіць рублі ў долары. На гэтым не ўдасца выйграць, бо курс будзе змяняцца павольна. А есці трэба кожны дзень, таму долары давядзецца мяняць назад на рублі».

12 кастрычніка стала вядома, што ўрад гатовы адкрыць у Міжнародным валютным фондзе страхавую крэдытную лінію. Калі ён таго даб'ецца, фінансавая стабільнасць будзе гарантавана.

**Яўген Васількоў**

# Падтрымка прыйшла, адкуль яе не чакалі

**Крыніца ва ўрадзе: МВФ можа выдзеліць прэвентыўную крэдытную лінію (ПКЛ).**

ПКЛ, у адрозненне ад крэдыту стэнд-бай, — гэта не жывыя грошы, а патэнцыйная магчымасць скарыстацца крэдытам у выпадку ўзнікнення надзвычайнай сітуацыі. Ніякіх спецыяльных умоваў пры гэтым не выстаўляецца.

ПКЛ могуць адкрываць і для краінаў, эканамічная палітыка якіх не цалкам адпавядае патрабаванням МВФ. Акрамя ПКЛ, ёсць яшчэ і гнуткая крэдытная лінія (flexible credit line, ГКЛ), прызначаная для краін, якія праводзяць эканамічную палітыку, цалкам адпаведную патрабаванням фонду.

Цікава, што ГКЛ дагэтуль былі адкрыты для трох краін — Мексікі, Польшчы, Калумбіі. Усе тры з'яўляюцца асабліва блізкімі саюзніцамі ЗША.

Пра варыянт прыцягнення сродкаў МВФ паведаміў агенцтву «Інтэрфакс-Захад» адзін з беларускіх удзельнікаў пасяджэння Рады кіраўнікоў МВФ і Сусветнага банка, якое прайшло ў Вашынгтоне.

У пасяджэнні Рады МВФ бралі ўдзел старшыня Нацбанка Пятро Пракаповіч і віцэ-прэм'ер Андрэй Кабякоў. Такім чынам, крыніцай мог быць хтосьці з іх або высокапастаўлены супрацоўнік спецслужбаў, які меў дачыненне да арганізацыі перамоваў.

Са словаў інфарматара лукашэнкаўскага агенцтва, сродкі МВФ кампенсуюць «магчымыя знешнія шокі». Маецца на ўвазе рэзкае павелічэнне цэнаў на расійскія энерганосьбіты ў выпадку далейшага пагаршэння адносінаў з Расеяй ці непрызнання Масквой вынікаў прэзідэнцкіх выбараў 19 снежня.

З вылучэннем ПКЛ Беларусь будзе застрахаваная ад сітуацый кшталту ліпеньскай, калі краіна элементарна не мела свабодных грошай, каб заплаціць па раптоўных рахунках «Газпрома».

Памер ПКЛ для Беларусі можа скласці да 2,95 млрд даляраў з павелічэннем да $5,9 млрд праз 12 месяцаў.

**Сяргей Гезгала**



# Кандыдат у прэзідэнты атрымаў Нобеля ў літаратуры

**Але нават Алексіевіч не папракнула б Льёса ў барыкаднасці.**

Перуанец Марыа Варгас Льёса (Mario Vargas Llosa) нарадзіўся ў 1936 годзе ў сям'і сярэдняга дастатку. Ягоны бацька, кіроўца аўтобуса, неўзабаве развёўся з жонкай і пакінуў яе пад апекай дзеда Марыа, ганаровага консула Перу ў балівійскім горадзе Качабамба. Там Марыа правёў першыя гады жыцця.

Консул Льёса валодаў баваўнавымі плантацыямі і забяспечваў сваю дачку і ўнука ўсім неабходным, строга забараняючы, аднак, інфармаваць хлопчыка пра лёс ягонага бацькі. Тым не менш, у 1946 г. бацькі Льёса аднавілі шлюб і пасяліліся ў Ліме, дзе Марыа скончыў найперш нядзельную школу, а затым, па патрабаванні бацькі, быў залічаны ў вайсковае вучылішча імя Леонсіа Прада, пасля выведзенае ім у рамане «Горад і псы».

Студэнтам Льёса выехаў у Еўропу, атрымаў там стыпендыю кшталту беларускіх, з Праграмы Каліноўскага.

Там першы раз ажаніўся — з кузінай, значна старэйшай за яго. Пазней яны разыдуцца, і Марыа ажэніцца з другой сваёй стрыечнай сястрой Патрысіяй, якая народзіць яму траіх дзяцей.

Сваю літаратурную біяграфію Льёса распачаў з палітычнага скандалу. Ягоны першы раман «Горад і псы» распавядаў пра тое, як з аддадзеных у тамтэйшую суворaўскую, дакладней, кадэцкую вучэльню падлеткаў «робяць мужчын», а калі дакладней — эмацыйна нявечаць. Дакладнасць, з якой пісьменнік апісаў здзекі дзедаўшчыны і дрэсуры, была ўспрынятыя як пасквіль на слаўныя традыцыі перуанскага войска. Кнігу нават публічна спалілі.

Скандал і поспех першага рамана ў 1963 годзе вызначыў у значнай ступені ўвесь будучы шлях пісьменніка.

Льёса заўжды адкрыта гаварыў пра неабходнасць сувязі пісьменніка і грамадства, пра неабходнасць быцця сацыяльным і палітычным. У той жа час папракнуць яго ў барыкаднасці і аднастайнасці не магла б нават Святлана Алексіевіч. Ягонымі героямі рабіліся журналісты («Гутарка ў Саборы»), служакі і прастытуткі («Капітан Панталеон і Рота добрых паслуг») і нават ён сам («Цётачка Хулія і пісака» пра вопыт свайго першага шлюбу).

У 1990 годзе Льёса пайшоў у палітыку. Ён балатаваўся ў прэзідэнты ад аб'яднанай апазіцыі — Дэмакратычнага фронту.

Палітычныя праціўнікі Льёса выкарыстоўвалі — акурат як цяпер супраць Някляева — выдраныя з кантэксту цытаты з «Войны канца свету» для дыскрэдытацыі пісьменніка, зачытваючы іх па радыё пад выглядам кавалкаў з выбарчай праграмы. У першым туры выбараў Варгас Льёса заняў першае месца з 34% галасоў, але прайграў у другім туры Альберта Фухіморы, дыктатару, пасля чаго з'ехаў за мяжу, пасяліўся ў Лондане і стаў падданым Іспаніі. Вопыт выбарчай кампаніі Варгас Льёса выкарыстаў у раманах «Рыба ў вадзе» і «Літума ў Андах», дзе апісаў «аголены трагізм нацыянальнай непрытомнасці».

**Мікола Бугай**

**Нобелеўскія лаўрэаты за апошняе дзесяцігоддзе**

2001 Відыядхар Найпал (Трынідад–Вялікабрытанія)
2002 Імрэ Кертэс (Венгрыя)
2003 Джон Кутзэе (ПАР–Аўстралія)
2004 Эльфрыда Елінэк (Аўстрыя)
2005 Гаральд Пінтар (Вялікабрытанія)
2006 Архан Памук (Турцыя)
2007 Дорыс Лесінг (Вялікабрытанія)
2008 Жан Мары лё Клезьё (Францыя)
2009 Герта Мюлер (Румынія–Германія)

## Сцісла

• **У Адміністрацыі прэзідэнта створаць Музей беларускай дзяржаўнасці.** Як паведаміў намеснік міністра культуры Тадэвуш Стружэцкі, ён размесціцца на месцы былога архіва. Экспазіцыя будзе пачынацца з 1990-х гадоў — ад пачатку існавання Рэспублікі Беларусь. У яе ўвойдуць як важныя дзяржаўныя дакументы, прыкладам, Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце, так і падарункі кіраўніку дзяржавы Аляксандру Лукашэнку. Новы музей мае выконваць прадстаўнічыя функцыі. Аднак для простых грамадзян Музей дзяржаўнасці таксама не будзе закрыты.

• **Аншлаг сабраўся на вечарыне памяці Ніны Мацяш.** Паэтычныя чытанні памяці паэткі пад назвай «Бабіна лета ў Белаазёрску» 6 кастрычніка сабралі ў мясцовым доме культуры паўнюткую залу. «Прыехалі людзі з Мінска, з навакольных гарадоў, з Беластока», — расказаў паэт Міхась Скобла. Белаазёрцы дабіваюцца змены назвы вуліцы, на якой жыла Ніна Мацяш. «Вуліца Леніна — адна з самых прыгожых у мястэчку». Пляменнік паэткі гатовы размясціць у кватэры Мацяш літаратурны музей. Ніна Мацяш хваробай была абмежаваная ў рухах, але стала сапраўдным маральным аўтарытэтам у сваім гарадку.

• **На рэканструкцыю Наваградскага замка ўдалося сабраць толькі 100 мільёнаў рублёў.** Латарэя «Скарбніца» не дала вялікіх збораў. Атрыманыя грошы выдаткуюць на распрацоўку праектнай дакументацыі.

• **У Івянцы (Мінская вобласць) упершыню пройдзе рэгіянальны творчы кірмаш.** Арганізатарамі выступаюць вытворца цукерак «Іўкон », Івянецкі музей традыцыйнай культуры і аддзел культуры Валожынскага райвыканкама. Сярод іншага, пройдзе дэгустацыя цукерак мясцовай вытворчасці. Будуць прадавацца вырабы з гліны, лазы і дрэва.

• **У Мінску адкрылася выстава выцінанкі Вячаслава Дубінкі.** Яе зладзіў Музей Багдановіча ў Мінску, што ў Траецкім прадмесці. У экспазіцыі прадстаўлены 32 творы мастака розных гадоў. Дубінка быў, як выразіўся мастак Алесь Марачкін, «класікам народнага мастацтва», універсальным творцам, хаця і не меў вышэйшай мастацкай адукацыі. Пасол Швецыі ў Беларусі Стэфан Эрыксан таксама лічыць Дубінку ўнікальнай з'явай беларускай культуры. Выстава працуе да 29 кастрычніка.

• **Фільм «Ваўкі» каштаваў больш за мільён даляраў.** Пра гэта паведаміў рэжысёр фільма Аляксандр Колбышаў. Прэм'ерны паказ фільма адбыўся ў Мінску 6 кастрычніка.

**Алесь Пілецкі; Сямён Печанко; МБ**

# Зачараванае герцагства

Другі раз каманда Штанге не змагла перагуляць маленькі Люксембург.

У Еўропе існуе шэсць зборных, якія традыцыйна лічацца пастаўшчыкамі пунктаў для іншых камандаў. Мяжой іх мараў з'яўляецца набраць у адборачнай групе некалькі пунктаў, зачапіўшы нічыю. Да такіх каманд адносяць Андору, Ліхтэнштэйн, Люксембург, Мальту, Сан-Марына і Фарэрскія выспы.

У 2000 годзе беларусы былі першымі, хто прайграў Андоры. Тое паражэнне каштавала трэнеру зборнай Сяргею Бароўскаму працоўнага месца.

Тры гады таму ўжо пад кіраўніцтвам немца Бернда Штанге наша каманда сенсацыйна саступіла ў Гомелі Люксембургу. Ужо ў дадатковы час гол у нашы вароты забіў Альфонс Левек. Прычым, у адрозненне ад нашых прафесіяналаў, для Левека футбол — не асноўнае месца працы. Яго сям'і належыць гатэль, дзе ён і працуе, а ў футбол гуляе ў вольны ад працы час.

Тады Штанге ўжо быў на валаску ад адстаўкі, але яму ўдалося пераканаць кіраўніцтва федэрацыі, што ідзе станаўленне новай каманды, таму такія з'явы часовыя. Немцу паверылі.

І праз тры гады новае спатканне з Люксембургам, нібы новы экзамен для Штанге. Трэнер казаў, што гуляць са зборнай з Вялікага герцагства нашы будуць, як з бразільцамі.

Можа, таму наша каманда выйшла на поле з двума апорнымі паўабаронцамі. І толькі з адным форвардам! Такая абарончая расстаноўка адразу выклікала непаразуменні. Пэўна, аднойчы апёкшыся на малацэ, на ваду будзеш дзьмуць.

Канечне, нашым можна ўсё спіхваць на македонскага арбітра, які не прызначыў пенальці пасля гульні люксембуржца рукой ва ўласнай штрафной. Але, што самае галоўнае, гульня была абсалютна біззубай. Як гэта кантраставала з нядаўнім матчам БАТЭ ў Лізе Еўропы, калі каменя на камені не пакінулі ад галандскага AZ.

Толькі ў сярэдзіне другога тайма гульня ажывілася. Некалькі разоў Люксембург выратоўваў варатар, а аднойчы пасля ўдару Карніленкі мяч трапіў у штангу.

А потым ключавой фігурай у сустрэчы стаў усё той жа Карніленка. Нападаючы пайшоў у жорсткі сутык з абаронцам Люксембурга, пасля чаго адразу пабачыў перад сабой чырвоную картку.

Больш навязаць свой футбол гаспадарам беларусы не змаглі. Люксембург нават меў шанец, каб вырваць перамогу. Але нулявая нічыя была найбольш заканамерным вынікам.

Пасля такога нечаканага і непрыемнага для беларусаў выніку матча можна не сумнявацца, Штанге чакае некалькі бяссонных начэй. А яго лёс зноў будзе няпэўным.

Ну а футбалістаў з Вялікага герцагства Люксембург можна павіншаваць з добрым вынікам. Увогуле, беларусы для люксембуржцаў — зручны супернік. У пяці сустрэчах яны аднойчы перамаглі і яшчэ двае гульні звялі да нічыёй. Нейкі зачараваны для нашых супернік.

**Зміцер Панкавец**



Карніленка паставіў крыж на шанцах беларусаў.

## Штанге: Не трэба ў паніку ўпадаць

На прэс-канферэнцыі перад матчам з Албаніяй трэнер Штанге зазначыў наступнае: «Не трэба ў паніку ўпадаць. Калі мы згулялі з Францыяй і выйгралі, то ўсе нас хвалілі. У аэрапорце сустракалі. А зараз хваля крытыкі. Гэта футбол. Тут адбываецца ўсё». Трэнер распавёў, што пасля гульні каманда была разгубленая, аднак на сёння псіхалагічная сітуацыя ў камандзе стабілізавалася.

Прычыны не самага прыемнага выніку Б.Штанге патлумачыў памылкамі ў тактыцы: «Мы шмат выкарыстоўвалі высокія перадачы. Гэта была наша памылка. Каманда Люксембурга лёгка з імі спраўлялася. У дадатак, нам не хапала апошняга таленавітага паса».

Гаворачы пра гульню з Албаніяй, трэнер зазначыў, што беларусы павінны абавязкова перамагаць і ў Мінску, і ў Цыране. «Албанія — стабільная каманда з моцнай абаронай, якую складаюць вялікія і моцныя хлопцы. Але гэтая зборная не настолькі моцная, як Францыя, Румынія і Боснія».

Штанге збольшага сваёй камандай задаволены: «У чатырох гульнях мы прапусцілі толькі адзін мяч. Гэтым вынікам можа ганарыцца любы трэнер».

**Алесь Пілецкі**

# Стадыён-прыгажун пабудуюць у Барысаве



Такога ў Беларусі яшчэ не было.

У лютым-сакавіку ў Барысаве пачнецца будаўніцтва новага футбольнага стадыёна. Ён будзе разлічаны на 13 тысяч гледачоў, пры насельніцтве горада 150 тысяч.

Праект новага стадыёна ўражвае. Гэта арэна новага пакалення. Ён паўстане на ўездзе з Мінска, побач з вядомым вайсковым гарадком Печы.

Праблема Барысава, што, маючы ўнікальную футбольную каманду, матчы групавых этапаў еўракубкаў яны вымушаны праводзіць у Мінску. Зараз гэтая праблема вырашыцца.

Займацца пабудовай будзе славенская кампанія Ofis arhitekti, якая збудавала падобны стадыён у Марыборы (Славенія). Будаўніцтва арэны было зацверджана старшынёй Мінаблвыканкама Барысам Батурам.

Тэрміны здачы аб'екта паставілі мінімальныя. Стадыён павінен зафункцыянаваць ужо ў сярэдзіне 2012 года. Агульны кошт будаўніцтва складзе 20 мільёнаў даляраў. Палову гэтай сумы выдаткуюць з рэспубліканскага бюджэту.

**ЗП**

## Сцісла

• **Затрыманая сутэнёрка праститутак з мінскай «стометроўкі».** Аператыўнікі лічаць, што гэтая 43-гадовая жанчына кантралявала працу дзяўчат у раёне плошчы Перамогі. У пачатку 2000-х яна прыцягвалася да адказнасці за аналагічнае злачынства.

• **У Беларусі 2 тысячы афіцыйных праститутак і 5 праститутаў.** Менавіта столькі асобаў стаяць на ўліку за занятак праституцыяй. Гэта значыць, іх затрымлівалі хоць аднойчы за гэтым заняткам. Пераважная большасць беларускіх праститутак выязджае на «працу» ў Маскву.

• **Пенсіянер памёр у грыбах.** Труп мужчыны знайшлі ў Мінску ў лясочку ў раёне 1-га Зарэчнага завулка. Прычынай смерці стала ішэмічная хвароба сэрца. Асобу памерлага высвятляюць.

• **Кіроўца збіў на пераходзе 8-гадовага хлопчыка і ўцёк.** Яго затрымалі ў вёсцы Пяскі Бярозаўскага раёна, па месцы жыхарства. Гэта 21-гадовы рабочы, ехаў ён без правоў. Здарэнне адбылося 8 кастрычніка каля восьмай вечара на вуліцы Леніна Белаазёрска. Вадзіцель ехаў на новай «Ладзе». У дзіцяці — пералом таза.

• **П'яны кіроўца знёс шлагбаўм на беларуска-польскай мяжы.** Тое здарылася ў «Пясчатцы». «Фардом» кіраваў п'яны 21-гадак з Брэста.

• **Жыхар Барысава пасварыўся з банкаматам «Беларусбанка».** 25-гадовы жыхар Барысава пашкодзіў банкамат. Яго дзеянні кваліфікавалі як «Хуліганства».

**Затрымалі злодзея, які краў рэчы з дзіцячых калясак у паліклініцы.** Гэта 31-гадовы мінчук, раней не раз судзімы. Забіраў усё, што каштоўнае: кашалькі, мабільнікі, лічбавыя камеры.

**МБ; БелаПАН**

# Матацыклісту ў аварыі на праспекце адарвала галаву



У Кручынскага нават мянушка была — Ферары.

Аляксандру Кручынскаму, дырэктару картынг-цэнтра на Макаёнка, было 24 гады.

Трагедыя здарылася ўначы з нядзелі на панядзелак, каля першай гадзіны.

Кіроўца «хуткай дапамогі» не саступіў дарогу матацыклу. Не саступіў, бо не разлічыў, што матацыкліст нясецца аж з такой хуткасцю. Удар, і «Ямаху R1» ад удару аб «Газэль» адкінула на сустрэчную паласу ў «Нісан Мікра». Сіла сутыкнення была настолькі вялікай, што часткі матацыкла даляцелі да скрыжавання праспекта Незалежнасці з вуліцай Акадэмічнай (каля 200 метраў).

Матацыклісту ж адарвала галаву. Ягонае цела без галавы падкінула так высока, што яно ўпала каля самага корпуса Нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта.

Дзяўчына, кіроўца «Нісана», не пацярпела, але яе машына не падлягае аднаўленню.

За рулём матацыкла, як высветлілася, сядзеў кіраўнік картынг-цэнтра, што на Макаёнка. Аляксандру Кручынскаму было 24 гады.

Сябры ў інтэрнэце пішуць, што «хуткасць была ягоным жыццём». У яго была мянушка Ферары.

Працягваючы спрэчкі, ці перавышаў Кручынскі хуткасць. Адлегласць разлёту абломкаў і цела паказваюць, што так, мабыць, перавышаў. Аднак відавочцы пярэчаць: характэрнага гулу перад аварыяй не было чуваць.

**Сяргей Гезгала**

**Бацькі былі супраць ягонага захаплення гонкамі**

У адным з інтэрв'ю Ферары распавёў, што бацькі былі супраць ягонага захаплення картынгам. Ён употай перапісаў заяву і замест групы па праграмаванні запісаўся ў гуртох картынга. Усё адкрылася праз два гады занятках, калі сваякі ўбачылі ў газеце здымак са спаборніцтваў. Кручынскі паказваў добрыя спартыўныя вынікі, арганізаваў паспяховы бізнэс па пракаце картаў на Макаёнка.

# Канарэйка здохла

**Віталь Тарас** піша пра фільм «Хросны бацька — 4».

Фільм НТВ «Хросны бацька — 4», як і тры папярэднія фільмы, не стаў адкрыццём для Беларусі. Прынамсі, для той часткі беларускіх грамадзян, якія чытаюць незалежную прэсу.

Але, паводле законаў дыялектыкі, колькасць пераходзіць у якасць. Можна ўслед за чукчам з анекдота пра аленяў, якія адзін за адным тапіліся ў багне, паўтарыць: тэндэнцыя, аднак!

Чатыры серыі фільма на адну тэму дазваляюць лепш зразумець прынцыпы, на якіх пабудаванае сучаснае тэлебачанне — што газпромаўскае, што беларускае дзяржаўнае.

Яны з бляскам праявіліся ў перадачах НТВ, прысвечаных Аляксандру Лукашэнку і экс-мэру Масквы Юрыю Лужкову.

НТВ належыць да разраду «трэшавага тэлебачання», ад слова «трэш» — смецце. Галоўнае, чым кормяць гледача на такіх каналах, — гэта забойствы, калецтвы, вычварэнні, скандалы з удзелам «зорак», у тым ліку і ў сферы палітыкі. Але гэта не значыць, што самі стваральнікі такога тэлебачання робяць яго абы-як. Там працуюць прафесіяналы ў сваёй справе, бо для камерцыйнага тэлебачання галоўнае — гэта рэйтынг.

Часам мы наіўна ўяўляем сабе, што дзяржава альбо дзяржаўная карпарацыя, ад якой залежыць канал, кіруе ім старым савецкім спосабам. Кіраўнік дзяржавы альбо лідар нацыі шэпча на вуха свайму памочніку нешта пра няўгоднага яму палітыка, памочнік звоніць кіраўніку тэлекампаніі... і вось заказ ужо выдаецца на-гара ў эфіры.

Насамрэч усё прасцей і складаней адначасна. Для таго каб улічваць палітычную кан'юнктуру і разам з тым не страчваць глядацкі рэйтынг, трэба мець дасканалы нюх.

Звярніце ўвагу — пакуль у Лужкова і ў Лукашэнкі ўсё было ў парадку, сюжэтаў пра іх амаль не было на НТВ. Уласна кажучы, з усіх



Такім расійскае ТВ паказвае кіраўніка Беларусі.

расійскіх палітыкаў на гэтым, як і на іншых расійскіх каналах, у навінах пастаянна прысутнічаюць толькі двое: Мядзведзеў і Пуцін. Што можа быць цікавага для расійскага гледача ў афіцыйных візітах і выступах усіх астатніх, хай сабе высокапастаўленых асобаў? Ад афіцыйнага пратакола ў звычайнага чалавека сківіцы зводзіць.

Ну, выступіць часам той самы Лужкоў са скандальнай заявай пра тое, што Севастопаль заўсёды быў і будзе расійскім. Ці кіраўнік Беларусі скажа нешта ў сваім стылі пра дружбу навек.

Дык што, справа ўсё-ткі ў палітзаказе? Сказалі «мачыць» — значыць, памры, але загад выканай? Не толькі. Мы забываем пра таго самага тэлегледача, які падсеў і ў масе сваёй застаецца «на іголцы» тэлебачання. Так, яно фармуе густы сваёй тэлеаўдыторыі. Але тая, у сваю чаргу, дыктуе тэлевізійнікам, якія стравы трэба падаваць у эфір.

Якая тэма ёсць адной з самых папулярных для масавага гледача? Гэта тэма, так бы мовіць, развянчаных куміраў.

Нішто не прыносіць абывацелю большай асалоды, чым відовішча паваленага калоса. Ужо якім калосам падаваўся той самы Лужкоў. А цяпер? Хто толькі не піхае, так бы мовіць, мёртвага льва.

Фільмы пра Лужкова—Батурыну, як і пра «Хроснага бацьку», матэрыялізаваліся не толькі з жадання найвышэйшага тандэма, але і з атмасферы амаралізму, якая пануе ў грамадстве, выгадаваным у тым ліку сучасным тэлебачаннем. ТБ лісліва ідзе за жаданнем плебсу. Усё як у старажытным Рыме — хлеба і відовішчаў!

Зразумела, Беларускае тэлебачанне ў чымсьці істотна розніцца ад НТВ. Ясна, што з'яўленне некаторых «сатырычных» праграм на АНТ, якія пахваліў нядаўна галоўны рэдактар «СБ», узнікла не ў выніку нейкага крэатыву, а таму, што была дадзеная ўстаноўка зверху: «Весела сустрэць Новы год». У выніку, напрыклад, у рубрыцы «Як ёсць» у праграме «Наши новости» нарадзіўся свежы і арыгінальны жарт пра Мядзведзева і «баян».

А разам з тым на Першым канале зноў закліканы пад сцягі змагання з апазіцыяй стары і загартаваны ідэалагічны баец Пракопаў. Як сказаў старшыня дзяржтэлерадыё Зімоўскі, галоўная станоўчая рыса гэтага «байца» ў тым, што яму нічога не трэба тлумачыць. Цынічна, але па сутнасці вельмі дакладна.

Фактычна, ва ўменні здагадацца, адчуць у паветры, чаго ад цябе чакае начальства, і палягае найвышэйшае майстэрства журналіста дзяржаўных СМІ. У гэтым БТ мала чым розніцца ад НТВ. І яшчэ адзін прынцып, які не можа быць пастаўлены пад сумнеў, — крытыкуй слабога! Калі некага з чыноўнікаў, альбо апазіцыянераў, альбо праваабаронцаў засудзілі, пасадзілі, збілі — «распні яго», прынізь і змяшай з брудам яшчэ больш.

Раней лічылася, што журналістыка павінна быць на баку слабога, выкрываць недахопы і злоўжыванні ўлады, моцных гэтага свету. Ёсць вядомая гісторыя пра канарэек, якіх раней трымалі ў шахтах. Як толькі ў шахце незаўважна для чалавека падымаўся ўзровень метану, яны пачыналі мітусіцца, крычаць і тым самым папярэджвалі пра небяспеку выбуху. На Захадзе ролю журналістыкі часам параўноўваюць з роляй тых канарэек: прэса павінна засцерагаць грамадства.

У нашым выпадку журналістыка адыгрывае процілеглую ролю. Канарэйка ўжо даўно задыхнулася ад газу ды здохла, але СМІ робяць выгляд, што ўсё ў парадку і ў паветры пахне парфумай.

З ПОШТЫ РЭДАКЦЫІ

# Беларускамоўнае справаводства. Першыя перамогі

Стаўленне дзяржапарата да мовы мяняецца на лепшае. Піша **Ігар Случак**.

На старонках «Нашай Нівы» пытанню захавання і развіцця беларускай мовы надаецца шмат увагі. У «НН» №26 за 2010 год быў надрукаваны артыкул пад назвай «Если не владеете русским, то советую заняться его изучением», дзе былі прыведзены прыклады крайне негатыўнага стаўлення некаторых чыноўнікаў да беларускай мовы, іх агрэсіўнае нежаданне весці справаводства, хаця б і часткова, на беларускай мове.

Але час ідзе і погляды некаторых персанажаў таго артыкула пакрыху змяняюцца. І што больш важна, змяняюцца яны, хоць і не хутка, на ўзроўні дзяржавы ў цэлым.

Так, змяніла сваё стаўленне да беларускай мовы ў лепшы бок Міністэрства энергетыкі, хоць раней проста неаднаразова ў сваіх лістах выказвала падзяку «за проявленную заботу и инициативу по сохранению национальных ценностей». Цяпер адказы на звароты з гэтай установы беларускамоўныя, і ніякіх складанасцей для іх пераход на беларускамоўе не выклікаў.

Нават прафесар Н.Суша, які казаў у сваім лісце, што калі Вы «не владеете одним из государственных языков — русским, то советую Вам заняться его изучением. Изучив русский язык, Вы тем самым сможете поднять свой культурный уровень и несколько расширить имеющийся у Вас кругозор», цяпер пачаў пісаць па-беларуску. Але пазіцыю сваю не змяніў і напісаў зноў усё вышэй сказанае, але толькі на беларускай мове.

Міністэрства адукацыі палічыла некарэктным даваць ацэнку выказванням рэктара Мінскага інстытута кіравання Сушы, але адзначыла, што «Міністэрства адукацыі можа выказаць толькі сваю пазіцыю — гэта добразычлівыя і ветлівыя адносіны да людзей незалежна ад іх веравызнання і мовы, на якой яны размаўляюць» і дзеля інфармацыі дало спасылку на артыкул 9.22 Адміністрацыйнага кодэкса — «Парушэнне заканадаўства аб мовах». Падаецца, свае вывады міністэрства ўсё ж зрабіла.

Свае высновы таксама зрабіла і адміністрацыя Завадскога раёна Мінска. Як паведаміла намесніца старшыні адміністрацыі Л.Бараноўская, рэктару ПУА «Мінскі інстытут кіравання» адміністрацыяй Завадскога раёна Мінска накіравана пісьмо аб недапушчальнасці некарэктных дзеянняў пры падрыхтоўцы адказаў на звароты грамадзян.

Між тым, акрамя прафесара Сушы, усё яшчэ застаюцца і іншыя чыноўнікі, упарта не жадаючыя весці справаводства па-беларуску і выказваючыя пагарду да мовы нацыі, на зямлі якой яны жывуць.

Але не будзем спяшацца з іх ацэнкамі, верагодна, у бліжэйшым часе яны самі перагледзяць сваю пазіцыю.

А аб тым, што адносіны да беларускай мовы пачынаюць мяняцца на дзяржаўным ўзроўні, сведчыць ліст з палаты прадстаўнікоў, дзе дэпутат Яўген Мельнікаў інфармуе, што «Праект Закона Рэспублікі Беларусь « Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб» прадугледжвае ўжыванне беларускай мовы. Так, згодна артыкула 12 законапраекта, падача зваротаў ажыццяўляецца на беларускай або рускай мове. Артыкул 18 абавязвае даваць адказы на мове звароту».

Таму, калі закон будзе прыняты, можна будзе павіншаваць усіх, хто падтрымліваў персанальную ініцыятыву «Справаводства па-беларуску!» з першымі перамогамі.

Пакрысе ўсе разам мы вернем беларускай мове статус адзінай дзяржаўнай мовы ў Беларусі.

Азнаёміцца з адказамі чыноўнікаў па пытанні пераводу справаводства на беларускую мову можна па спасылцы ihar-sluchak.livejournal.com.

# Пра цыганоў і беларускія школы

**Расізм зачапіў і славянскія народы: яны непрыязна ставяцца да так званых асоб каўказкай нацыянальнасці і да цыганоў.** Асабіста мне ні першыя, ні другія не зрабілі нічога дрэннага, але калі я ўсё часцей сустракаю на мінскіх вуліцах нязвыклы гурток смуглявых жанчын у доўгіх спадніцах, мяне таксама перапаўняюць незразумелыя адмоўныя пачуцці. Але толькі нядаўна я зразумела, што пачуцці гэтыя — зайздрасць…

Тыдзень таму сталі вядомы папярэднія вынікі перапісу насельніцтва 2009 года. Лічбы, скажу адразу, жахлівыя, і таму СМІ адразу запоўніліся крытычнымі матэрыяламі наконт фальсіфікацыі вынікаў і няправільнай метадалогіі правядзення перапісу. Усё гэта слушна, але ў мяне ёсць падставы хаця б трохі давяраць гэтым лічбам.

Па-першае, асноўнымі носьбітамі мовы ў нас з'яўляюцца людзі сталага ўзросту ды вяскоўцы, але, згодна ўсё таго ж перапісу, насельніцтва краіны скарацілася на паўмільёна, а ў вёсках засталося толькі каля 25 адсоткаў беларусаў. Калі паразважаць, то стане зразумела, што асноўная частка насельніцтва проста адарвана ад тых, хто павінны вучыць іх любові да роднай мовы. Жыццё ў гарадах з іх арыентаванасцю на глабалізацыю ставіць ва ўмовы, калі веданне беларускай мовы нічым не спрыяе, а часам і замінае павышэнню эканамічнай забяспечанасці.

Глядзім далей, хто застаўся ў нас у гарадах. Гэта дзеці, якіх з кожным годам меншае, і людзі сярэдняга ўзросту. Апошніх можна падзяліць на дзве групы: карэнных беларусаў, і тых, хто прыехаў з бліжэйшага замежжа і мовы проста не ведае. Такіх досыць шмат, бо яны засталіся тут, узяўшы шлюб альбо дзякуючы прымусоваму размеркаванню з савецкіх універсітэтаў. Карэнныя беларусы мову ведаюць, але не карыстаюцца ёю за непатрэбнасцю ў штодзённым ужытку. І менавіта яны заўсёды станоўча ставяцца да беларускай мовы, бо заспелі яшчэ тыя часы, калі практычна ва ўсіх школах навучанне было па-беларуску.

Школы — гэта другое, школ у нас няма, як няма і каму вучыцца ў іх. Верасень у гэтым годзе пачаўся са скандалаў. У шэрагу гарадоў не адчынялі першых класаў з беларускамоўным навучаннем. Нават у такіх, як Гродна і Магілёў. А між тым школа — галоўны гадавальнік нацыянальнай самасвядомасці і моўных ведаў. Менавіта ў школе з расейскамоўнага дзіцяці за адзінаццаць год можна зрабіць сапраўднага беларуса, бо гэта другі пасля сям'і інстытут, які выхоўвае ў чалавека яго будучыя маральныя каштоўнасці і штодзённыя звычкі. Але ў апошнія гады беларускія школы імкліва знікаюць, і адзінае на Гродна беларускамоўнае дзіця вымушана навучацца асобна ад сваіх аднагодкаў…

Вось таму ў мяне і ёсць падставы верыць вынікам перапісу насельніцтва. І ёсць падставы зайздросціць цыганам. Нацыя качэўнікаў, раскіданая па ўсім свеце, здолела захаваць сваю мову. Таму што ўсе яны трымаюцца адзін аднаго, таму што захоўваюць і клапоцяцца аб сваіх традыцыях.

**Міхаліна Дзятлік, Мінск**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адраса. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# Прадпрымальнік Дзмітрый Ус: Сям'я баіцца, што мяне заб'юць

Прадпрымальнік Дзмітры Ус — не самы тыповы кандыдат на гэтых прэзідэнцкіх выбарах. Яго не аднясеш да апазіцыянераў. Ініцыятыўная група таксама зусім не маленькая (1300 чалавек). Ну і відавочна, што ён не вылучэнец ад улады. У працоўным офісе Уса на вуліцы Наватарскай на сцяне вісяць аўтографы жыхароў мінскага мікрараёна Курасоўшчына, якія пратэставалі пасля вынікаў мясцовых выбараў. Гутарка з кандыдатам.

**«Наша Ніва»: Дзмітрый Іванавіч, як апынуліся ў палітыцы?**

**Дзмітрый Ус**: З'явіўся неяк спантанна. Я быў нейкі час дэпутатам Мінскага гарсавета. Потым былі мясцовыя выбары 25 красавіка. За маё вылучэнне падпісалася 5 тысяч чалавек. А ў выніковых лічбах аказалася, што прагаласавала за мяне людзей у два разы менеі, чым падпісалася. Людзі былі вельмі абураныя, бо прызначанага дэпутата яны ніколі не бачылі і не кантактавалі з ім. Мяне гэта таксама абурыла. Пасля здарэння я і паставіў сабе задачу спыніць гэтыя бясчынствы, што ідуць зверху. Я хачу, каб людзі самі абіралі дэпутатаў. Трэба зрабіць усё магчымае, каб выбары былі справядлівымі, а не такімі, як зараз.

**«НН»: Лічыце, што ўжо саспелі, каб адразу пераскочыць з гарсавета ў прэзідэнты?**

**ДУ**: Я ўжо балатаваўся ў палату прадстаўнікоў, але мяне не зарэгістравалі. Ярмошына зняла мяне за дзень да асноўнага дня выбараў, хоць у датэрміновых удзельнічаў, за віншавальныя паштоўкі, якія я як дэпутат накіроўваў жыхарам акругі. Маўляў, датэрміновая агітацыя. Я гатовы рабіць справы. Я ведаю, што рабіць, каб у нас было дэмакратычнае грамадства. А то цяпер «Белую Русь» за бюджэтныя грошы пояць, кормяць. Настаўнікаў выпіхваюць на пікеты. Адбываецца маразм. Мы ўсе, падаткаплатнікі, плацім свае грошы, а нехта адзін выкарыстоўвае іх у сваіх мэтах. Найперш патрэбнае дакладнае размежаванне ўсіх галін улады: заканадаўчай, выканаўчай, судовай.

«Белую Русь» за бюджэтныя грошы пояць, кормяць. Настаўнікаў выпіхваюць на пікеты.

**«НН»: Што ўдалося зрабіць падчас працы дэпутата?**

**ДУ**: Я вырас у Курасоўшчыне, правёў там усё сваё маленства. Ужо нябожчык, старшыня Мінскага гарвыканкама Паўлаў прапанаваў мне абірацца па Першамайскай акрузе, але я адмовіўся. Бо хацеў працаваць дзеля гэтых людзей. А так надаваў вялікую ўвагу капітальным рамонтам дамоў, добраўпарадкаванню тэрыторыі, дарогам.

**«НН»: А чаму перасталі задавальняць улады як дэпутат?**

**ДУ**: Напэўна, я стаў больш дапамагаць людзям, чым уладзе. Вось на мяне і ўз'еліся. Прывяду прыклад: робіць рамонт у доме на вуліцы Ландара. Раніцай прывозяць трубы, а вечарам ужо забіраюць назад. Людзі тэлефануюць мне з істэрыкай, даводзілася кантраляваць. Вось па каштарысе ёсць газавыя пліты, грошы выдзеленыя, а іх не ставяць. Уладам нявыгадна, каб дэпутат быў ад людзей, а не іхні, каб ім падпарадкоўваўся. Вось і рабілі ўсё, каб мяне прыбраць. Але калі робіш людзям дабро, то яны і адказваюць табе тым жа.

**«НН»: Пастаянна былі ў кантакце з людзьмі?**



Я магу даказаць, што выбары фальсіфікуюцца.

УЛАДЗЬ ГРЫДЗІН

**ДУ**: Кожны месяц два разы былі прыёмы людзей. Былі дзве ЖКГ — 23-я і 64-я. І столькі пытанняў абмяркоўвалі, пачынаючы ад тараканаў, скончаючы асабістымі праблемамі. Трэба было, як псіхолагу, кожнага выслухаць, даць параду, дапамагчы. Я стаў дэпутатам у 28 гадоў. Перамог у першым туры кандыдата ад улады — галоўнага лекара бальніцы хуткай дапамогі Нарушэвіча.

**«НН»: Ёсць спадзяванне, што можаце перамагчы на гэтых выбарах?**

**ДУ**: Я магу даказаць, што выбары фальсіфікуюцца. Гэта мая галоўная задача — паказаць сапраўднае аблічча выбараў.

**«НН»: А як зрабіць тое думаеце?**

**ДУ**: Гэта не сакрэт. Ідзе праца з людзьмі. Складаная і сур'ёзная. Так проста яе не пакажаш. Трэба сабраць подпісы большай колькасці людзей, чым прагаласавала па афіцыйных лічбах. Гэта будзе найбольш відавочна. Людзі часам, як дзеці малыя. Вераць усяму, што кажа радыё і тэлебачанне. А яно ж не заўсёды так. Трэба неяк расплюшчыць вочы.

**«НН»: Якія ў Вас эканамічныя прапановы?**

**ДУ**: Найперш рабіць льготы для вытворцаў. І не толькі для недзяржаўных, але і для дзяржаўных. Вытворчасць павінна даваць план. З Расіяй таксама трэба вярнуць ранейшыя адносіны.

**«НН»: Вы за далейшую інтэграцыю з Расіяй?**

**ДУ**: Эканамічную — так. Але аб'ядноўвацца ў адну дзяржаву — не. Трэба аднавіць той транзіт, які мы амаль згубілі пасля таго, як Аляксандр Рыгоравіч стаў шчоўкаць нафтавымі засоўкамі. Нельга губляць даходы, якія маглі б мець.

**«НН»: Як ставіцеся да прыватызацыі буйных прадпрыемстваў?**

**ДУ**: Яны нармальна працуюць, навошта іх прыватызоўваць. Хай працуюць на карысць дзяржавы.

**«НН»: А як так выйшла, што ў Вас амаль аднолькавыя ініцыятыўныя групы з Мікалаем Статкевічам?**

**ДУ**: У нас шмат супольных знаёмых. Я быў памочнікам Георгія Таразевіча (былы старшыня Вярхоўнага Савета БССР, быў блізкі да «Народнай Грамады» Мікалая Статкевіча — «НН»). Вырашылі людзі працаваць на абодвух, нічога страшнага ў гэтым.

**«НН»: Як сям'я паставілася да Вашага рашэння балатавацца?**

**ДУ**: Баяцца людзі. Напрыклад, што мяне заб'юць. У 2004 годзе я ляжаў два месяцы ў коме — таксічнае атручэнне. Пайшоў на планавую аперацыю — і не выйшаў з наркозу. І «там» пабываў — і вярнуўся. Таму я спакойна стаўлюся да ўсяго. Я хачу проста сказаць, што некаму наша бясчынства трэба спыняць. Увогуле, трэба маладых падтрымліваць. Мае людзі абышлі шмат кватэраў. Дык вось, падтрымка прэзідэнта ўсяго дзесьці 25%. Проста трэба не дапусціць фальсіфікацый на ўчастках.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**

**Дзмітрый Ус**

нар. у 1971 у Мінску. Бацька памёр, калі Дзмітрыю было 16 гадоў. Маці — эканаміст. У 1988 пайшоў працаваць на завод «Інтэграл» токарам. Пазней працаваў будаўніком. У 1992 прызначаны дырэктарам прадпрыемства «Трывіум», якое займаецца выдавецтвам атласаў, картаў. Прадпрыемства працуе па сёння. У 2003 скончыў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт па спецыяльнасці «Правазнаўства». З 1999 па 2003 быў дэпутатам Мінскага гарсавета. Жанаты, гадуе сына.

## Гайдукевіч: Не хачу ўдзельнічаць у гэтым спектаклі

Што б гэта значыла?

Нечаканую навіну прынесла пятніца. Лідар ліберал-дэмакратаў Сяргей Гайдукевіч адвёз у ЦВК заяву, што не збіраецца ўдзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах.

Гайдукевіча традыцыйна называлі спарынг-партнёрам Лукашэнкі на выбарах. Былі меркаванні, што яго трымалі ў запасе, каб стварыць імітацыю канкурэнцыі на выбарах, калі ад удзелу адмовяцца ўсе апазіцыянеры.

На выбарах 2001 і 2006 Гайдукевіч нязменна займаў трэцяе месца пасля дзейснага кіраўніка дзяржавы і адзінага кандыдата ад апазіцыі. Ліберал-дэмакрат заўсёды лаяльна ставіўся да Лукашэнкі, звяртаючыся да яго ў кампліментарнай форме.

На мінулых выбарах Лукашэнка нават іранічна прызнаўся, што галасаваў за Гайдукевіча. За сваю ж лаяльнасць старшыня ЛДП атрымліваў ва ўзнагароду месца ў парламенце.

Такая сітуацыя цягнулася практычна да 2008 года, калі партыя Гайдукевіча адмовілася ўдзельнічаць у выбарах у палату прадстаўнікоў. Казалі, што ўсе намаганні будуць кінутыя на выбары прэзідэнцкія. Насамрэч, магчыма, Гайдукевічу ўжо тады намякнулі, што больш уладам ён не патрэбны.

На сёлетніх мясцовых выбарах ЛДП закрыла ўсе мінскія выбарчыя ўчасткі. Людзі былі абсалютна розныя — ад прадпрымальнікаў з гадавым даходам у некалькі сотняў тысяч рублёў да стралкоў аховы чыгуначнага вакзала. Урэшце, не прайшоў ніводны з іх.

Пра тое, што партыя трапіла ў няласку, можна меркаваць яшчэ з таго, што быў арыштаваны намеснік Гайдукевіча Уладзімір Карунас.

Сам жа Гайдукевіч рабіў мноства папулісцкіх прарасійскіх заяваў. Ён абяцаў у выпадку перамогі ўвесці расійскі рубель, а таксама прызнаць незалежнасць Абхазіі і Асеціі.

Ініцыятыўную групу Гайдукевіч сабраў нават большую, чым у Лукашэнкі. Дарма, што ў ёй знайшлі багата мёртвых душаў. Нават адзін сябар Цэнтрвыбаркама ў ёй выявіўся. Усё адно зарэгістравалі.

Зборшчыкаў подпісаў за Гайдукевіча ніхто толкам не бачыў, хоць ён і заяўляе, што паспеў сабраць 100 тысяч подпісаў.

Сваё рашэнне аб зняцці пракаментаваў тым, што не хоча ўдзельнічаць у спектаклі. Цікава, а раней ён гэтага не заўважаў?

**ЗП**

## Сцісла

• **Пятро Барысаў зняўся на карысць Рымашэўскага.** Кандыдат-пенсіянер аб'ядноўвае сваю каманду з хрысціянскімі дэмакратамі. Барысаў таксама прапанаваў астатнім кандыдатам зняцца на карысць Рымашэўскага. Інжынер-будаўнік на пенсіі падаў дакументы на рэгістрацыю ў прэзідэнты, матывваваўшы вылучэнне «кавардаком у краіне». У яго ініцыятыўнай групе было 112 чалавек.

• **Уладзімір Някляеў заклікаў да вылучэння адзінага прадэмакратычнага кандыдата.** Лідар кампаніі «Гавары праўду!» мяркуе, што ў «многіх нашых апазіцыйных лідараў узнікла, як гаварыў таварыш Сталін, «галавакружэнне ад поспехаў». На самой справе ніхто, у тым ліку я, не чакаў, што людзі так актыўна пачнуць падпісвацца ў падтрымку дэмакратычных прэтэндэнтаў у прэзідэнты».

• **«Сур'ёзных кандыдатаў — чацвёра: Кастусёў, Саннікаў, Раманчук, Някляеў», — мяркуе мясцовы лідар з Вілейкі Уладзімір Малярчук.** Інтэрв'ю Малярчука можна прачытаць на сайце NN.BY. Дарэчы, Малярчук увайшоў у раённую выбарчую камісію.

**Алесь Пілецкі; МБ**

## З ПОШТЫ РЭДАКЦЫІ

### Як я перахітрыў лукашэнкаўцаў

**Прыходжу на працу — да мяне падскоквае намеснік дырэктара.** «Падпішыцеся за кіраўніка дзяржавы». Не падпішашся, то кантракт не падоўжаць. Але подпісу майго яны не здабудуць! Кажу: «Вы знаеце, Аляксандр Леанідавіч, я ўжо дома падпісаўся, да мяне прыходзілі зборшчыкі». — «Да-да, два раза нельзя, нельзя», — кажа ён. Прыйшлі і дамоў. Кажу: на працы падпісаўся.

А самі мы з жонкай, хоць жонка і інвалід, і хадзіць ёй цяжка, схадзілі на рынак і там падпісаліся за Някляева, Станкевіча [імаверна, Статкевіча або Саннікава — Рэд.] і Рамановіча [імаверна, Раманчука або Рымашэўскага. — Рэд.]. Зычу ім поспехаў і дзякую за смеласць.

**Адам Бужма, Брэст (прозвішча, самі разумееце, мяняю)**

# «У гасцях у кандыдата»: Уладзімір Някляеў



Котцы Басі хутка 20 год.

Трапіць у госці да Уладзіміра Някляева аказалася складаней, чым на прыём да прэзідэнта. Напэўна, баіцца паказваць сваю маладую жонку, гадалі мы. Але ўсё было якраз наадварот. На шчасце, сумесны праект карэспандэнта «Салідарнасці» Настассі Зелянковай і фатографа «Нашай Нівы» Юліі Дарашкевіч не застаўся без героя. Мы ж, у сваю чаргу, даведаліся, як жывецца ў Уладзіміра Някляева ягонай котцы Басі, што паэт чытае, калі не піша, і як ён правяраў вернасць сваёй жонкі.

Прызнаюся шчыра: з Уладзімірам Някляевым мяне звязваюць практычна сямейныя сувязі. Калі б не ён, мой шчаслівы дзевяцігадовы шлюб мог бы і не адбыцца. Некалькі вершаў класіка ў выкананні майго будучага мужа на світанку студэнцкай маладосці зрабілі сваю справу — ну а што яшчэ трэба «нацыянальна свядомай дзяўчыне»? Таму ў госці да Някляева я збіралася з самымі роднаснымі пачуццямі.

Шкада толькі, што трапіць удалося не адразу. Аказалася, што жонка паэта, пра маладосць і характво якой не пісаў толькі лянівы, сама не рвалася рабіць мужу рэкламу. «Не хоча яна ў мяне публічнасці», — апраўдваўся Уладзімір Пракопавіч. Урэшце, бастыён быў узяты прыступам.

Насуперак усім чаканням, Вольга сустрэла нас вельмі ветліва.

— Праходзьце, будзем зараз боршч есці, — ледзь не з парога заявіла гаспадыня.

Адмовіцца ад такой звабливай прапановы мы проста не маглі. (Хутка, як бач, прыйдзецца пераймяноўваць наш праект — «Хто лепш за ўсіх прыкорміць журналістаў».)

Пакуль Вольга завіхалася на кухні, Уладзімір Пракопавіч арганізаваў экскурсію па кватэры.

### Трэніруемся на котках

Не паспелі мы прайсці ў гасцёўню, як насустрач нам выбегла... котка. Пасля абвінавачванняў «зялёных» у здзеках з дадзеных прадстаўнікоў фаўны ад хвастатай істоты ў доме паэта патыхала нейкім сюррэалізмам.

— Наша Бася, — прадставіў Някляеў котку.

Дзеля справядлівасці адзначым: Бася выглядала даволі худой, дый поўсць на ёй ладна пазношвалася.

— Дык усё-ткі здзекуецеся? Не корміце, — паспрабавалі мы ўесці кандыдата.

— Бася нарадзілася роўна за год да жнівеньскага путчу ў Маскве. Значыць, у гэтым годзе ёй дваццаць. У чалавечым летазлічэнні — 140. Вы сустракалі бабулек, якія ў такім узросце выглядаюць лепей? — неяк асабліва ўважліва ўглядзеўся ў нас Някляеў. — Вы наогул у Беларусі каго-небудзь у такім узросце сустракалі? Тоўстага альбо худога, з поўсцю ці без?

— Бася ў любові жыве, — сказала Вольга. — Інакш даўно б памерла. Валодзя ёй на хвост выпадкова наступіць — і адразу шкадаваць, выбачацца: «Бася, прабач...» А пра яго богведама што пішуць.

Як выявілася, Вольгу вельмі зачапіла абвінавачанне «зялёных» на адрас мужа.

— Ды калі б вы толькі ведалі, як ён жывёл любіць! І жывёлы яго! Сабакі, каты — усе да яго збягаюцца. Рукі ліжуць, твар. Ды ні адзін «зялёны» з імі так не займаецца, як Валодзя. Усіх бяздомных кожную раніцу кормім...

— Добра, не хвалюйся, — супакойвае паэт жонку. — Затое яны маёй драме «Армагедон» якую рэкламу зрабілі! Можа, хоць цяпер беларусы знойдуць час прачытаць, задумаюцца. Дарэчы, я сам не думаў, што сюжэт «Армагедона» так дакладна ляжа на нашу рэчаіснасць. І там, і тут усе спробы пабудаваць нешта талковае, слушнае скончаюцца будаўніцтвам вар'ятні. А чаго чакаць ад яе насельнікаў?.. Вось яны і пішуць, што я не магу быць прэзідэнтам, таму што ў дзяцінстве ката забіў. Забіў, не забіў — ніхто не бачыў... Але гэта можа прывесці да канфлікту з Еўропай — і наогул да сусветнай катастрофы. Адзін да аднаго — Армагедон.

Гаспадыня тым часам спрабуе пакарміць котку, каб тая супакоілася, не нервавалася з-за гасцей. «Вельмі дрэнна есць, — скардзіцца Вольга. — Ледзь не з рук карміць прыходзіцца... »

Працяг на старонцы 10.



А што, калі я котку якую прывяду?

## Някляеў: «Так, я прызнаю Абхазію»

**Новы шум вакол Някляева: у часе сустрэчы з беларускімі блогерамі лідар кампаніі «Гавары праўду» двухсэнсоўна выказаўся па палітычна датклівым пытанні прызнання незалежнасці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі.**

Правакатыўнае пытанне задала яму блогерка lamma_mamma.

— Калі вы прэтэндуеце на месца кіраўніка дзяржавы, значыць, у Вас ёсць сваё меркаванне пра Абхазію… Ці прызнаяце вы Абхазію?

— Я? Абхазію?! (Смех у зале.)

— Скажыце, вы прызнаяце яе як самастойную дзяржаву?

— Так, я прызнаЮ Абхазію. Я прызнаЮ Абхазію, таму што ведаю, што ёсць абхазы… Ёсць такая культура, ёсць такая літаратура. Я ведаю гэта і прызнаЮ, што ёсць такая Абхазія.

«Гаворка не ішла пра палітычнае прызнанне Абхазіі і Асеціі. Размова вялася пра культурнае самавызначэнне абхазскага народа, — удакладніў кандыдат у прэзідэнты карэспандэнту «Нашай Нівы». — Так, я выступаю за культурна-этнічную аўтаномію Абхазіі. Але дзяржаўныя межы Грузіі я б не парушаў», — сказаў У.Някляеў.

Аднак некаторых блогераў такая двухсэнсоўнасць абурыла. «Някляеў — гэта чалавек «ні пра што». Ты можаш мне сфармуляваць яго пазіцыю? Чалавек можа гаварыць пра ўсё, але пры гэтым — ні пра што. Пазіцыянавання няма ніякага, наогул. Ні аднаго канкрэтнага пытання, ні аднаго пэўнага адказу, дзе б там ні было», — піша эканаміст Сяргей Чалы.

«З піяр-гледзішча — поўная катастрофа», — мяркуе палітолаг Віталь Сіліцкі.

Абхазія і Паўднёвая Асеція былі населеныя нацыянальнымі меншасцямі, з вялікай доляй этнічна грузінскага насельніцтва. У Абхазіі грузіны складалі нават большасць. Расія прызнала незалежнасць гэтых лапікаў зямлі пасля таго, як акупавала іх тэрыторыі. Там адбыліся этнічныя чысткі, у выніку якіх грузінская частка насельніцтва была выгнаная.

Менавіта непрызнанне незалежнасці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі стала лакмусавай паперкай геапалітычнага развароту лукашэнкаўцаў. «Іх жа ніхто не прызнаў, адзін нейкі востраў толькі прызнаў», — ва ўласцівым стылі пакпіў Аляксандр Лукашэнка. Катэгарычна супраць прызнання незалежнасці гэтых краін выступілі Еўрасаюз і ЗША.

У той жа час за прызнанне Абхазіі выказваліся ў той ці іншай форме лідар экс-камуністаў Сяргей Калякін і Сяргей Гайдукевіч. Блізкі паплечнік Калякіна Сяргей Вазняк цяпер — адзін з лідараў кампаніі «Гавары праўду».

**Наста Шамрэй, Зміцер Панкавец; Мікола Бугай**

# «У гасцях у кандыдата»: Уладзімір Някляеў

Працяг са старонкі 9.

Трэба прызнаць, што да Басі тут сапраўды ставяцца вельмі кранальна: і месца ў яе асабістае за сталом, і корм — самы лепшы. І як мы ні стараліся адысці ад размоў пра кацiных (баючыся абвінавачванняў у ангажаванасці), усё роўна пераключаліся на іх.

Па ходзе высветлілася, што і радавод у Басі — шляхетны. Самі Раінчыкі ў родзе (ну, зразумела, іх гадаванцы). А вось сваім імем котка абавязаная Барбары Радзівіл. Калі яе прынеслі дадому да Някляева, па тэлебачанні — тады яшчэ сапраўды беларускім — ішла праграма, у якой апавядалася легенда пра Чорную панну Нясвіжа.... Вось і назвалі котку — таксама чорную — у гонар Барбары.

Паралельна мы даведаліся, што любяць Някляева не толькі каты.

— Аднойчы, яшчэ дзіцём, быў у лесе са сваім дзядзькам, — успамінае паэт. — Ён адышоўся крыху, а я бачу: сабака да мяне ідзе. Здаравенны такі, прыгожы. Я яму насустрач. Чую, мой дзядзька лямантуе, аж у істэрыцы б'ецца: «Гэта воўк! Бяжы!» А я як ішоў, так і іду. І воўк да мяне. Падышоў, лізнуў мяне ў шчаку, зірнуў на дзядзьку са здзіўленнем — і пайшоў сабе прэч.

Яшчэ б! Хто ж захоча падзяліць лёс няшчаснага кацяняці!

### Мара паэта

Агляд кватэры шмат часу не заняў. У працэсе высветлілася, што гэтая двушка непадалёк ад Лошыцкага парку належыць Вользе — дакладней, дасталася ёй ад бацькоў.

— Увогуле, я тут у прымаках, — смяецца паэт. — Бацькоўскі дом пакінуў брату, ранейшую кватэру — першай жонцы. Маёмасцю не звязаны. На ўздым лёгкі. Так што, калі што, чамадан у рукі — і на выхад.

Але, мяркуючы па ўсім, у бліжэйшы час Някляеву гэта не пагражае. Іх з Вольгай сямейныя адносіны блізкія да ідэальных.

Жонка — узорная хатняя гаспадыня (пасля сыходу з часопіса «Крыніца» з такім прозвішчам на працу яе больш не бяруць). Затое ў доме парадак і ўтульнасць, капустабаршчы на пліце. А калі трэба, можа і звярстаць, і карэктуру вычытаць. Ну, проста мара паэта!

— Але ж сварыцеся часам? — не верым мы ў такую ідылію.

— Ды як і ўсе, — паціскае плячыма Вольга.

— Вы яе не слухайце, — перабіў жонку кандыдат. — У мяне жонка — скарб. Яна не тое, што не крычыць — голас не падвышае.

Можа, і хацела б, ды не ўмее. Так выхаваная. Калі крыўдзіцца, то перастае са мной размаўляць. Напэўна, калі б я першы не саступаў — цэлы год магла б маўчаць. А спрачацца з ёй наогул няма сэнсу. Кажа: «Твой бацька кім быў? Радавым? А мой — падпалкоўнікам. Так што будзь ласкавы...»

Вольга такі расклад у рэгаліях не ва ўсім пацвярджае. Паводле яе слоў, адносіны ў сям'і самыя дэмакратычныя.

— А што, калі я котку якую прывяду? — на справе вырашыў праверыць дэмакратычнасць жонкі кандыдат.

— Пойдзеш з ёй на дах мяўкаць, дзе ў нас каты збіраюцца, — не прайшла тэст Вольга. — І чаму гэта ты «котку»? А што, калі я — «ката»?

— Дык ты ж ведаеш, што я з катамі раблю, — разрагатаўся Уладзімір Пракопавіч.

Дэмакратыя ў сям'і Някляевых не пракацiла.

Вольга таксама распавяла, як некалі будучы муж зладзіў ёй праверку на вернасць.

— Неяк узімку Валодзя прапанаваў перайсці з ім па лёдзе праз Свіслач. Было жудасна страшна. Дзе-нідзе лёд быў зусім тонкі. Разломваўся, бугрыўся. А ён ідзе, чорт... Што мне было рабіць?.. Потым гэта стала нашым своеасаблівым рытуалам: узімку перайсці па небяспечным лёдзе. Як загадаць наперад на штосьці... Вось і цяпер — як па небяспечным лёдзе...

— А я тады падумаў, загадаў: пойдзе — значыць, назаўжды. Ды калі б і не пайшла... Правёў бы берагам. Але яна пайшла. І не падвяла мяне ні ў чым, ні разу.

У выніку — пяць гадоў шчаслівага шлюбу. Дарэчы, размовы пра «маладую жонку Някляева» Вольгу вельмі весяляць.

— Усе чамусьці думаюць, што ён ажаніўся ледзь не з семнаццацігадовай. Мне ўжо сорак (трэба прызнаць, выглядае Вольга значна маладзей — аўт.). А тут у «маладзіцы» запісалі.

Муж глядзіць на жонку здзіўлена:

— А чым табе гэта не падабаецца?

### «Чукча не чытач»

Пры аглядзе кватэры ў вочы адразу кінулася вялікая колькасць карцін на сценах — Вольга захапляецца жывапісам, сябруе з многімі мастакамі.

— А пад гэтай карцінай я быў зачаты, — з гонарам дэманструе паэт лясны краявід над камодай. — Яна ў нашай хаце ў Крэве вісела. Яе падарыў маёй маці пан (Крэва ў той час польскім мястэчкам было) за тое, што добра вучылася. Аўтар невядомы, але з нашых краёў. Гэта адзінае, калі не лічыць Евангеле і «Урок Закона Божага», што я ўзяў з дзедавага дома.

А вось кніг у кватэры паэта было менш, чым мы чакалі.

— Выцеснілі з кніжнай шафы ўсіх канкурэнтаў? — пацікавілася я.

— Проста пакінуў на той кватэры. Няма дзе іх захоўваць.

А вось нядаўна з Масквы прывёз дзясятак кніг Яўлінскага ды іншых разумных лібералаў. Усё хачу зразумець, чаму ў Расіі ліберальныя ідэі нікому не патрэбныя?

Ліберальныя ідэі Яўлінскага нас чамусьці таксама не асабліва цікавілі. А вось бар паэта ўвагу прыцягнуў.

— Ды я практычна і не п'ю, — апраўдваўся кандыдат, спрабуючы загарадзіць алкагольны «кампрамат».

Але ад нашага пільнага позірку нічога не схавалася.

— А што гэта ў вас? — заўважылі мы бутэльку дзіўнага выгляду і колеру.

— Настойка кары дуба, — растлумачыў паэт. — Вельмі добры сродак. Я нават сваю нованароджаную дачку калісьці ў гэтай настойцы купаў. Мне параілі дадаваць у ваннач-ку, сказалі, што добра ўмацоўвае. Дык вось, калі да нас медсястра прыйшла — укол дзіцяці не магла зрабіць. Іголка не ўваходзіла — так умацаваў.

— А цяпер што ўмацоўваеце? — з'едліва пацікавіліся мы.

— Так, агульны тонус, — сышоў ад адказу кандыдат.

### Пра казу і баян

Перамясціўшыся на кухню, мы ўзяліся за боршч. Ён у Вольгі атрымаўся на славу. Пасля падаспелі катлеты, гарбата з цукеркамі. І нават дыня на дэсерт. Гаспадыня ў Някляева, і праўда, выдатная.

Але асабліва ўразіў на кухні сам гаспадар, які старанна мыў посуд і клапатліва нарэзаў нам дыню.

— Для мяне мыццё посуду наогул не праблема. Як і бульбу драць. У гэты час добра думаецца, — растлумачыў паэт.

Тое, што гэты працэс — не паказальнае выступленне на камеру, пацвердзіла і Вольга. Як выявілася, усе паказальныя выступленні нас чакалі яшчэ наперадзе.

— Хадзем — я вам лыжы свае пакажу, — паклікаў нас на балкон Някляеў. — Мяне актывісты кампаніі «Гавары праўду» вельмі прасілі, каб я ў лыжах сфатаграфаваўся. Я нават новы верш для гэтага прыдумаў — як варыянт ужо вядомага: «Стаю на балконе я ў лыжы абуты, паехаць хачу — ды няма парашута!» Але і лыжы на балконе не былі пустым рэквізітам. Някляеў сапраўды рэгулярна рассякае ўзімку па Лошыцкім парку.

А вось з хулахупам справы ішлі складаней. Руйнуючы ўсё навокал, паэт намагаўся раскруціць злашчасны абруч. Але безвынікова. Затым у ход пайшоў трэнажор жонкі... Спартыўны запал Някляева мы здолелі суцішыць не адразу.

Дапамагло высокае мастацтва. Заўважаная намі гітара была вынятая з кута і пакладзеная на калені кандыдату. Спявае Някляеў, трэба прызнаць, добра. Такімі тэмпамі хутка з кандыдатамі можна будзе арганізаваць цэлы прэзідэнцкі ну калі не аркестр, дык ансамбль песні і танца дакладна.

Прычым Някляеў можа ў ім і на кантрабасе збацаць, і на акардэоне (калі каго трэба) падмяніць.

Дарэчы, ягоную гісторыю з акардэонам ужо даўно перадаюць з вуснаў у вусны.

— Каб купіць інструмент, бацькам давялося карову прадаць, — згадвае паэт. — А я так не хацеў на ім граць. Проста выкінуць — шкада. Вырашыў: хай лёс сам распарадзіцца. Узгрувасціў на віядук ля чыгункі і пастанавіў: калі ад руху цягніка баян упадзе ў мой бок — буду граць, не — значыць, не дадзена. Цягнік ідзе, а ён усё не падае. Што ж, лёсу давялося крыху дапамагчы.

Акрамя гульняў з лёсам ёсць у кандыдата і іншыя захапленні. Так, кожны чацвер кандыдат ходзіць у лазню. Ці патоп, ці сусветная рэвалюцыя — усе ведаюць: увечары па чацвяргах Някляева не турбаваць.

Праўда, веніка і капелюха для лазні навідавоку мы не знайшлі. Затое заўважылі цюбецейку.

— А гэта мне мае сябры казахі падарылі, — пераключыўся Някляеў, тут жа насоўваючы шапку на галаву. Дык вось хто фінансуе кампанію кандыдата!

А праз секунду ў руках паэта ўжо ззяў бізун, зроблены з казінай ножкі (да ведама «зялёных», таксама падарунак казахаў).

— А вось так я абыходжуся з жонкай, — паспрабаваў нагляднa прадэманстраваць ён.

Але выхаваўчы працэс сарваўся. На крыкі прыбегла Бася, і Някляеў тут жа ўзяўся гуляцца з коткай.

На развітанне паэт падпісаў некалькі кніг на памяць, а Вольга гасцінна запрасіла завітваць на боршч. Падобна на тое, што наш праект пачынае прыносіць свае дывідэнды — прынамсі, у галодны час нам будзе куды вярнуцца.

**Настасся Зелянкова,**
**фота Юліі Дарашкевіч**



**Разносячы ўсё вакол, паэт намагаўся раскруціць злашчасны абруч.**



**Спявае Някляеў, трэба прызнаць, добра.**

# Дзядзька Рычард

**Алесь Кіркевіч.** Эсэ.



Неяк давялося мне ехаць у Мінск у пустым аўтобусе разам з адным гарадзенцам, які добра помніў «слаўныя 90-я». Па ходзе размовы я прыгадаў «дзядзьку Рычарда» — яскравага нацыяналіста, які памёр гадоў восем таму. Ён жыў у нашым двары. У маёй дзіцячай свядомасці ягоная асоба пакінула наступны адбітак: па вуліцы Багдановіча маршыруе сіваваты падцягнуты, зачасаны пад прабор «дзядзька Рычард», нечым падобны да Васіля Быкава, у вайсковай гімнасцёрцы, з бел-чырвона-белым значкам на грудзях ды здаравязным сабакам на шворцы. У адказ на нашыя дзіцячыя шкоды і пастаянныя мацюкі, «дзядзька» часта лаяў нас на чыстай беларускай мове і чамусьці пасылаў «цалавацца са СВАІМ Лукашэнкам». Ягонае прынцыповае нежаданне адказваць на маё «драстуйце» я хутка прасёк, таму стараўся казаць «добры дзень», на што чуў задаволены адказ.

Мой спадарожнік, зразумеўшы, пра каго я кажу, дапоўніў і без таго маляўнічы партрэт гарадзенскага БНФаўца. Перад выбарамі 1994 года, калі Лукашэнка быў «на кані», «дзядзька Рычард» неяк сеў у аўтобус, завешаны партрэтамі «маладога барца з карупцыяй». Доўга не чакаючы, ён пачаў здзіраць партрэты «крамлёўскага стаўленіка», што выклікала абурэнне ўсяго аўтобуса. Моўчкі, ігнаруючы крытыку, «дзядзька» дастаў з сумкі кухонны нож і ўжо з яго дапамогай працягваў справу — у аўтобусе ўсталявалася магільная ціша да самага канца паездкі. Пазней, у 1995 годзе, Фронт ладзіў збор подпісаў у падтрымку роднай мовы. Людзі, перапуджаныя «гвалтоўнай беларусізацыяй», адмаўляліся падпісваць, таму актывісты прыходзілі ў лепшым выпадку з парай запоўненых паперын. Толькі «дзядзька Рычард» прыносіў поўныя стосы.

Прыкладам стратэгіі нашага героя быў наступны выпадак: адзін гаспадар не пагадзіўся падпісваць, на што Рычард адказаў: «Добра, але зараз я пастаўлю крыж на вашай кватэры — прыйдуць хлопцы і спаляць дзверы». Гаспадар рызыкаваць, вядома, не стаў.

У чым феномен гэтага чалавека? Ён не быў мітынговым аратарам, не меў грашовых каналаў для раскруткі сваёй дзейнасці, не ездзіў у Брусэль сустракацца з эўрапейскімі палітыкамі. Ён проста рабіў сваю справу — аддана, напорыста, метадычна. Рабіў на сваім месцы, у сваім горадзе. Каб мы мелі па пары такіх «байцоў» ва ўсіх абласных і раённых цэнтрах — мы мелі б зусім іншую краіну. Бо такія людзі — соль зямлі, а «калі соль страціць сілу — чым асоліш яе?» (Мв. 5:13)

Адзін мой сябар, Андрэй Вашкевіч, які чытае лекцыі па гісторыі ў Еўрапейскім гуманітарным універсітэце, аднойчы прапанаваў паразважаць, якая асоба ў беларускай літаратуры адыграла ролю, аналагічную ролі Міцкевіча і Сянкевіча ў польскай, Шаўчэнкі ва ўкраінскай літаратуры. Хто з нашых класікаў змог не проста апісаць пакуты народа і сялянскі побыт, але стварыць міф на аснове нацыянальнай гісторыі, а гэта значыць паэтычную аснову нацыянальнага светапогляду? Пасля нядоўгіх развагаў аказалася, што на гэтую ролю падыходзіць толькі Караткевіч. Не трэба тлумачыць, што паміж ім і яго «калегамі» з блізкага памежжа — амаль 100 гадоў...

Мараль у тым, што не трэба сябе ўвесь час параўноўваць. Калі Бог дасць, мы ўсё адно дойдзем да таго, да чаго мусім прыйсці. Своечасова. Нераскрыты патэнцыял нашага народа толькі чакае зручнага моманту, каб прагучаць на ўвесь свет! Цяпер не час для дэпрэсіі, самакапання, сварак. Адкладзіце далей томік Дастаеўскага. Выключыце тэлевізар. Кіньце перажываць з-за таго, што ў нашай гісторыі чагосьці не было. Мажліва, яно яшчэ напарадзе. І нават калі высветліцца, што ніякай Беларусі яшчэ насамрэч НЕ АДБЫЛОСЯ — значыць, самы час брацца за яе стварэнне!

## АНДРУСЬ ХРАПАВІЦКІ



ГАМОН, ПРАЙГРАЛІ ВЫБАРЫ!

Лёгкае порна беларускай палітыкі
Эрэкцыя ёсць, але без аргазмаў
Я скончаны палітолаг, таму завяду сабе сшытак
І буду запісваць туды палітыкі нашай маразмы

Не, крытыкаў і без мяне хапае
Таму запішуся таксама ў кандыдаты
Буду сядзець у эфіры «Белсата»
На шоу «Перад выбарам» чарговым этапе

Буду казаць пра стратэгіі перамогі,
Што я найлепш падыходжу, каб стаць адзіным
І цераз слова буду прыгадваць Бога,
Бы ён у мяне ў камандзе разам з Францыскам Скарынам

Буду трасці праграмай, бы мне яе напісалі
Кругман разам з Нобелем і Аркуш разам з Вялесам
Яшчэ ажанюся, жывот нарашчу, каб фоткі лепш выглядалі
Сына назаву Алесем, дачку — Алесяй

Ствару сабе сайт і ў фэйсбуку ўсіх заспамлю
Буду найбольш прасунутым кандыдатам у інтэрнэце
Буду ўжываць стратэгію перамогі штаба Абамы
Недарэмна ж вучылі на семінарах пра сеціва

Прыдумаю лагатып, аватары намалюю,
Уступлю ў БНФ, бо кожны там пабываць павінен
А лепей уласную партыю зарэгіструю
Чым больш вагі, тым шанцаў болей стаць адзіным

Зважайце, я новы твар у беларускай палітыцы
Адукаваны, з воляй да ўлады, таму пацясніцеся
Ой, пачакайце... Улады могуць пяць год яшчэ весяліцца
Мне толькі нядаўна стукнула трыццаць.

**Андрусь Храпавіцкі**

кампутарнік, інтэрнэт-выдавец. Жыве між Глыбокім і Вільняй.

## ТАЦЦЯНА БАРЫСІК



ЛЯ АПАРАТА

Паўсюль багата развялося неабыякавых людзей!
Праз іх уночы давялося гнаць самагон — так спакайней.
Калі над лесам пасвятлела, стаў разбіраць свой апарат.
І раптам — грукаюць у дзверы сусед і мой стрыечны брат,
Туды-сюды, такая справа, маўляў, прыйшлі пагаманіць,
Без самагонкі — не гамонка, маўляў, ты мусіш нам наліць.
Сусед уеўся мне ў пячонкі: аддай, пазыч... І так штодня.
Хацеў прагнаць, дык ён жа з братам, а брата нельга, бо радня.
Ну, то паклікаў іх на кухню свайго напою паспытаць:
Парэзаў агуркоў і сала, а больш няма чым частаваць.
Сусед на трохлітровы слоік зайздросным вокам пазіраў,
Бо ў яго брага не ўдалася, відаць, дражджэй пашкадаваў.
Сядзеў і брат як мыла з'еўшы, адна размова — 'шчэ налей...
Тады ўключыў я тэлевізар — каб хаця трохі весялей.
На першую праграму трапіў, але няўдала выбраў час,
Ну, дзякуй, дружа-тэлевізар, павесяліў на гэты раз!
«Калі вы ведаеце хаты, у каторых гоняць самагон,
Паведамляйце неадкладна!» — і на экране тэлефон.
А ўжо за шыбамі шарэе, пара начынне прыбіраць!
Набраўся брат як дзюдзя гразі, сусед пайшоў — нібыта спаць.
У майго брата, як звычайна, — давай па першай, па другой,
Пасля па трэцяй, па чацвёртай, пасля давай яшчэ з сабой...
Ды толькі я не пагадзіўся: хоць брат ты мой, а хлеб еш свой,
Патрэбна вадкая валюта, каб дзе купіць на поле гной.
— А, дык табе начхаць на брата! Глядзі, спамянеш ты мяне!
З майго двара ідзе дахаты і на ўсю вуліцу кляне.
А я зрабіў свае высновы — схаваў у яму апарат.
Займаўся чырванню дзень новы!
Хто ж здацць мяне — сусед ці брат?

**Тацяна Барысік**

супрацоўніца жыллёва-камунальнай гаспадаркі з Магілёва. Каранямі з-пад Глуска.

## АЛЕСЬ САКАЛОЎ

ВОСЕНЬСКАЕ

Мінулага перагарнуў гады,
Усмешка асвятляла ўспаміны,
Плылі ў ружовай квецені сады,
І ў блакіце хор спяваў птушыны
Пра прыгажосць гарэзлівай жанчыны,
Мінулага перагарнуў гады.

У верасні — дажджы і халады,
Разносіць вецер сумныя навіны,
У небе хмары — чорны знак нуды,
І па асфальце мокрыя машыны
Распырскваюць струменьчыкі вады,
У верасні — дажджы і халады.

Дождж плача, пакідаючы сляды,
Вятрыска дрэў разгойдвае галіны,
У траву павольна падаюць плады,
Зусім сівы, даўно немалады,
Стаю адзін ля восеньскай сцяжыны,
Дождж плача, пакідаючы сляды.

Мне да царквы — хвіліны дзве хады,
Я за парогам сціплае хаціны,
Гучаць званы — урачыстасцю краіны,
І пасвятлелі сёлы, гарады,
У Божы храм нясу свае правіны,
Да вечнасці — хвіліны дзве хады...

**Алесь Сакалоў**

настаўнік, вёска Баркалабава (Магілёўская вобласць)

# «В лесу родилась ёлочка», або Дзіўны лёс беларускай князёўны

Пра Раісу Гедройць (Кудашову) піша **Алег Дзярновіч.**

Спадкаеміца княскага роду Гедройцяў, Раіса, увайшла ў літаратурныя энцыклапедыі пад лаканічным азначэннем «расійская і савецкая паэтэса». Але ў расійскай літаратуры яна вядомая пад прозвішчам мужа — як Раіса Адамаўна Кудашова. З усяго ж яе творчага даробку шырокую вядомасць мае фактычна толькі адзін твор. Затое з гэтым вершам знаёма практычна ўсё дарослае і дзіцячае насельніцтва на прасторах былога СССР — Раіса Гедройць напісала словы дзіцячага шлягера «У лесе нарадзілася ялінка» («В лесу родилась ёлочка»).

Фактаў з біяграфіі Раісы Гедройць вядома зусім мала.

Яе бацька быў паштовым чыноўнікам у Маскве. Сама Раіса нарадзілася там у 1878 г., скончыла жаночую гімназію, служыла гувернанткай у князя Кудашова, род якога меў татарскае княска-мурзінскае паходжанне. Ягоныя продкі паходзілі з найвышэйшых слаёў цюркскай знаці.

Пазней Раіса Гедройць пабралася з ім шлюбам.

Сучаснікі прыгадвалі, што княгіня Раіса Кудашова валодала несумненнымі педагагічнымі здольнасцямі. Яна працавала выхавацелькай, настаўніцай, а ў савецкі час некалькі дзесяцігоддзяў — яшчэ і бібліятэкаркай.

## Песня

Раіса пачала пісаць яшчэ ў маленстве. Пазней яна прыгадвала, што «не хацела быць вядомай, але не магла не пісаць».

**Гедройці ў ВКЛ**

Сваё паходжанне Гедройці вядуць ад вялікага князя літоўскага Тройдзеня. Яго род, зафіксаваны ў позніх генеалагічных легендах як род Кітаўруса (ці Гіпацэнтаўра), панаваў у Літве напярэдадні «роду Калюмнаў» (Гедымінавічаў). Таксама Гедройці былі ў фаворы за часамі Соф'і Гальшанскай, жонкі Ягайлы, і біскупа Мельхіёра Гедройця, які даў прытулак Мацею Стрыйкоўскаму, першаму гістарыёграфу Вялікага Княства.

Імем Ежы Гедройця названа вуліца ў Мінску.

У снежні 1903 г. у навагоднім нумары часопіса «Малютка» быў надрукаваны верш «Ёлка», падпісаны адным з крыптанімаў Раісы «А. Э.» Праз два гады гэты верш быў пакладзены на музыку Леанідам Бекманам. Сам жа Леанід Карлавіч Бекман быў кампазітарам-аматарам, асноўная ж яго прафесія — агранамія. Музыку для песні ён напісаў для сваёй дачкі. На самой жа справе, Бекман папросту прыстасаваў матыў нямецкай каляднай песні пад памер расійскага тэксту.

Праўда, абставіны напісання, ці прыстасавання, мелодыі былі незвычайнымі.

У Маскве, у доме Бекманаў №5 у Малым Патрыяршым завулку 30 кастрычніка 1905 г. толькі што нарадзілася маленькая Воля, у той жа ж дзень старэйшай дачцэ Веры споўнілася два гады. Але ж гэта быў час палітычных хваляванняў, рэвалюцыі 1905 года. Масква была ахоплена ўсеагульным страйкам, не ездзілі трамваі, не працаваў водаправод. У снежні з'явіліся барыкады, куды знеслі і браму дома Бекманаў. А на паддашку гэтага ж дома прафсаюз булачнікаў хаваў зброю.

Бегчы з маленькімі дзецьмі з паралізаванага горада не было куды. Кулі маглі патрапіць у вокны, таму сям'я адседжвалася ва ўнутраных пакоях. У такой крытычнай сітуацыі галава сям'і і вырашыў напісаць песню для ўласных дзяцей, каб нечым адцягнуць іх увагу. Нотнай граматай Бекман сам не валодаў, і ноты запісала ягоная жонка. Так з'явілася песня «У лесе нарадзілася ялінка».

Першапачатковы тэкст верша складаўся з 56 радкоў, але дзеля песні верш падкарацілі. Фактычна, для песні была пакінутая толькі цэнтральная частка верша, а пачатак і заканчэнне прыбраныя. Усё ж словы песні — гэта менавіта верш Раісы Кудашовай: з апісаннем характва лясной ялінкі і фінальнай сцэны — з высяканнем мужычком ёлачкі «пад корань» і радасці дзяцей вакол каляднага ўпрыгожання.

Проста песенька паступова стала вельмі папулярнай. Але сама аўтарка словаў даведалася, што яе верш быў пакладзены на ноты, даволі позна — у 1921 г. Зусім выпадкова, у цягніку, Раіса Кудашова пачула, як дзяўчынка спявае яе «Ялінку».



## Выпрабаванні для «Ялінкі»

Але калядная скіраванасць песні стварыла на нейкі час таксама праблемы для яе публічнага выканання. У 1927 г. у рамках антырэлігійнай кампаніі бальшавіцкая партыя забараніла Калядныя святкаванні, неад'емным элементам якіх была ўпрыгожаная ёлка. Спыніліся дзіцячыя карагоды вакол каляднага дрэва.

Вяртанне да традыцыі адбылося толькі ў 1936 г., пасля таго як 28 снежня ў газеце «Праўда» быў апублікаваны артыкул кандыдата ў члены Палітбюро ЦК УКП(б) Паўла Постышава:

«У дарэвалюцыйны час буржуазія і чыноўнікі буржуазіі заўсёды ладзілі на Новы год сваім дзецям яліну. Дзеці працоўных з зайздрасцю праз акно паглядалі на зіхоткую рознакаляровымі агнямі ёлку і дзяцей багацеяў, якія весяліліся вакол яе. Чаму ў нас школы, дзіцячыя дамы, яслі, дзіцячыя клубы, палацы піянераў пазбаўляюць гэтага выдатнага задавальнення дзетак працоўных Савецкай краіны? Нейкія, не інакш як «левыя» загіншчыкі зганьбілі гэтую дзіцячую забаву як буржуазную задуму. Варта гэтаму няправільнаму асуджэнню ёлкі, якая з'яўляецца выдатнай забавай для дзяцей, пакласці канец. Давайце арганізуем вясёлую сустрэчу Новага года для дзяцей, задаволім добрую савецкую ёлку ва ўсіх гарадах і калгасах».

Ёлка аказалася вельмі гнуткім рытуальным аб'ектам у розныя гады і стагоддзі ў розных краінах. Да самай рэвалюцыі яна выконвала не толькі калядныя функцыі, але была і навагодняй ёлкай. Ну а ў савецкі час яе функцыі сфармулявалі наступным чынам: навагодняя ёлка — гэта свята шчаслівага дзяцінства ў сацыялістычнай краіне.

Такім чынам, упрыгожаная ёлка вярнулася да дзяцей у СССР, але ўжо не як Калядная, а ўжо толькі як Навагодняя. У 1939 г. Постышава расстралялі як ворага народа. У 1956 г. рэабілітавалі. Але вернутая ягонымі намаганнямі ёлка ўжо засталася надалей.

Не проста вярнулася, але стала навагоднім дзіцячым гімнам і песня пра ялінку. Праўда, «мужычок» у словах песні на некаторы час быў заменены на «дзядок» («старичок») — каб не праглядалася ніякая класавая прыналежнасць.

Сам верш быў зноў перавыдадзены толькі ў 1941 г. у зборніку, складальніца якога Эсфір Эмдэн адмыслова адшукала аўтарку верша і пазначыла прозвішча Кудашовай у тэксце.

## Легенды пра Саюз пісьменнікаў

Рэабілітацыя навагодніх святкаванняў у СССР супала з часам стварэння Саюза пісьменнікаў. У літаратурных колах існуе легенда, як было раскрытае аўтарства Кудашовай пры ўступленні яе ў Саюз пісьменнікаў СССР.

Аднойчы на прыём да Максіма Горкага прыйшла паважнага веку жанчына, якая паведаміла, што хацела б уступіць у гэтую шаноўную арганізацыю. Калі ж стваральнік Саюза пісьменнікаў (а Максім Горкі рабіў гэта ў 1934 г. на замову Сталіна), пацікавіўся, што ж напісала наведніца ягонага кабінета, то пачула ў адказ: «Толькі танюткія дзіцячыя кніжкі». У адказ Горкі сказаў, што ў Саюз прымаюць толькі сур'ёзных аўтараў, якія маюць раманы і аповесці. «Не дык не», — заўважыла кабета і скіравалася да выхаду, але потым павярнулася і запыталася: «Можа, Вы чулі хаця б адзін мой верш?» І прачытала знакамітыя словы: «У лесе нарадзілася ялінка, у лесе яна расла, зімой і летам зграбнаю, зялёнаю была...» Легенда сцвярджае, што, пачуўшы знакамітыя радкі, Горкі у тую ж хвіліну прыняў Раісу Кудашову ў сябры Саюза пісьменнікаў, што ў той час давала немалыя прывілеі.

Паводле ж іншай версіі легенды, падобнае спатканне ў Раісы Кудашовай адбылося з Аляксандрам Фадзеевым, намеснікам Горкага па Саюзе. Фадзееў запытаўся: «Дык гэта Вы напісалі?» — і пачаў прыгадваць, што ўпершыню ён яшчэ дзіцём прачытаў гэты верш і калі дайшоў да апошніх радкоў, то пачаў плакаць — так шкада яму было ялінкі. Аляксандр Фадзееў выклікаў сваіх супрацоўнікаў і аддаў распараджэнне ўсяляк дапамагаць Раісе Кудашовай.

Як бы ні розніліся гэтыя дзве версіі, рэальнай асновай у іх можа быць адна — у другой палове 1930-х гадоў яна даволі эпізадычна кантактавала з кіраўніцтвам новастворанай арганізацыі-монстра і была прынятая ў Саюз пісьменнікаў, дзякуючы шырокай вядомасці толькі аднаго свайго верша — «Ялінкі».




Пра Веру Гедройць, жыццё якой было напоўненае экзотыкай, а то і выклікам — нават па нашым часе, — чытайце ў адным з наступных нумароў газеты.

# Тэрор і прапаганда ў акупаванай Беларусі




Выйшаў чарговы «ваенны» ARCHE.

У адрозненне ад 5-га нумара за 2010 год, дзе гутарка ішла збольшага пра вайсковыя аспекты Другой сусветнай, у новым, 7—8-м здвоеным нумары акцэнт робіцца на акупацыйнай палітыцы ў Беларусі.

Пуга ці пернік? Які быў выбар нямецкай акупацыйнай улады ў дачыненні да беларускага насельніцтва? У нумары, які атрымаў назву «Тэрор і прапаганда ў акупаванай Беларусі», — працы, прысвечаныя нацысцкай прапагандзе, нямецкіх даследчыкаў Аляксандра Піліча і Тэрэзы Фогт. А таксама працы, прысвечаныя непрыхаванаму тэрору: тэксты беларускай даследчыцы Вольгі Голеты, ізраільскіх гісторыкаў Егуды Баўэра і Шлёма Клеса і нямецкага — Аляксандра Фрыдмана. У новым нумары таксама разглядаюцца агульныя праблемы акупацыі — нямецкі навуковец Фелікс Акерман даследуе іх на прыкладзе захопленай Горадні. А яшчэ — праца Юры Грыбоўскага аб паліцыйных фармаваннях.

Акрамя гэтага, у новым ARCHE друкуюцца гістарычныя першакрыніцы, сярод якіх акты гаўляйтара Беларусі Вільгельма Кубэ.

Традыцыйна ў нумары — каляровыя і чорна-белыя фатаграфіі ваенных часоў і ўзоры агітацыйнага мастацтва. Укладка — мапа «Беларусь пад нямецкай акупацыяй», дзе пададзена адміністратыўнае дзяленне Беларусі ў час нямецкага захопу з пазначэннем населеных пунктаў, знішчаных фашыстамі, а таксама канцлагераў.

**КМ**

# Захварэў? Не ляжы ў ложку

Дзевяць прынцыпаў лячэння прастуды.

«НН» сабрала дзевяць пашыраных памылак пры агульнавядомым захворванні.

### 1. Захварэў? Ляжы ў ложку

Такі прынцып працуе толькі ў тым выпадку, калі хвароба набрала абаротаў: з тэмпературай, кволасцю і іншымі сімптомамі сапраўднага грыпу. Калі ж гаворка ідзе пра звычайную прастуду, то лепш не імкнуцца яе «пераляжаць» — гэта дадатковая нагрузка на лёгкія і бронхі. Тым больш, што расслабленне арганізма спрашчае задачу для вірусаў.

### 2. Пап'ю антыбіётыкаў, і ўсё пройдзе

Антыбіётыкі не прызначаныя для лячэння вірусаў, а тым больш прастуды, імі лечацца ўскладненні. А звычайны прыём антыбіётыкаў — гэта проста моцны ўдар па арганізме. Падчас прастуды лепш за ўсё проста «зняць» сімптомы — кашаль, насмарк, боль у горле.

### 3. Кроплі ў нос

Зразумела, што лепшага выйсця пры насмарку, чым кроплі ў нос, не знайсці. Але, як усе медпрэпараты, яны маюць пэўныя асаблівасці. Галоўная з іх: калі ўжываць кроплі доўга, то ёсць верагоднасць атрымаць залежнасць ад іх.

### 4. Калі адразу збіць тэмпературу, яна больш не з'явіцца

Дактары не раяць штучна зніжаць тэмпературу, калі яна не вышэйшая за 38,5. Лепш за ўсё дапамагае пры павышанай тэмпературы халодны кампрэс на лоб.

### 5. Не варта мыцца

Звычайна лічыцца, што хворы чалавек, які прымае ванну, мае рызыку пагоршыць свой стан, прастудзіцца яшчэ мацней, але гэта не так. Вада, наадварот, выводзіць праз скуру таксіны, якіх падчас хваробы з'яўляецца шмат. Галоўнае — не мерзнуць пры выхадзе з ванны.

### 6. Часнок і цыбулю ў нос

Часнок і цыбулю можна і нават варта есці. Але рабіць з яго кроплі ў нос мала таго што непрыемна, дык яшчэ і шкодна, бо апякаеце слізістую. Вось з'есці трошкі часнаку для прафілактыкі карысна, але не трэба злоўжываць.

### 7. Банькі ўратуюць

Яшчэ адна традыцыя, пра якую лепш забыць, — ставіць банькі. Гэта не толькі нязручна, але і шкодна: прыліў крыві да лёгкіх забяспечыць пагаршэнне іх працы, а лёгкія падчас прастуды і без банек аслабленыя. Ёсць прасцейшыя і сучаснейшыя метады лекавання.

### 8. Задушыш кашаль — атрымаеш пнеўманію

Гэтак бывае, але з адной, важнай агаворкай: калі чалавек пакутуе на хранічнае лёгачнае захворванне. Астатнія могуць смела душыць кашаль, асабліва сухі — ён раздражняе слізістую, таму наносіць шкоду.

### 9. Каб аднавіць сілы — трэба шмат есці

Наадварот, арганізм падчас хваробы часта адмаўляецца ад ежы, а мы піхаем яе ў сябе. Рэч у тым, што сілы, якія арганізм звычайна выкарыстоўвае для стрававання, падчас хваробы перакідваюцца на барацьбу з вірусам. Таму ешце штосьці лёгкае, кшталту садавіны. Тлустае і вострае, лішнія тлушчы і бялкі лепш адкласці.

**Юрась Ускоў**

ЛЮБОШЧЫ

# Дурныя міфы пра сэкс



### Сэкс — суцэльная генетыка

Ёсць распаўсюджаны стэрэатып, што мужчынская сэксуальнасць досыць агрэсіўная, а жаночая — пабочны прадукт жадання нарадзіць.

Сапраўды, у сэксу ёсць генетычны складнік, але ніхто не сказаў, што ён адзіны. Наша сэксуальнасць выкліканая таксама псіхалагічнымі і сацыяльнымі прычынамі. Гэта добра відаць на сэксуальных разладах, калі яны ўзнікаюць у выніку псіхалагічнай траўмы або нават духоўнага крызісу.

Сэкс — гэта не проста жывёльны інстынкт. Гэта і духоўная патрэба.

### Сэкс заўжды можна палепшыць

Гэта вялікая аблуда XX стагоддзя. Рэклама ўганяе нам у вушы пра сэкс без перапынку і асалоду без межаў. Нам даводзяць, што заўсёды можна палепшыць, аптымізаваць, дасягнуць новых нязнаных перажыванняў. Часта гэта робіцца прычынай засмучэнняў і расчараванняў...

Добры сэкс не церпіць рэкордаў.

### Сэкс на пляжы — гэта нешта

Любошчы ў публічным месцы — пашыраная фантазія як у многіх мужчын, так і жанчын, а пляж узначальвае хіт-парад жаданых месцаў. Але не для ўсіх і не заўсёды.

Акрамя звычайнага забруджвання, пляжныя любошчы часам вядуць да заражэння ўнутраных органаў.

А многім людзям нязручна, ой як нязручна без звыклай канапы і бялізны!

### Калі засцерагаешся, зацяжарыць немагчыма

Ад сэксу бываюць дзеці. Як бы вы ні засцерагаліся. Ані кантрацэптывы, ані, тым больш, перарваны полавы кантакт, пры якім мужчына не эякулюе ў жанчыну, не дае гарантыі.

Займаецеся сэксам, будзьце гатовыя ўзяць на сябе адказнасць за выхаванне дзяцей.

**Сямён Цыбульскі**

# Жанчын магнітам вабіць чырвонае

У мужчыны, што надзеў на першае спатканне што-небудзь чырвонае, значна больш шанцаў на поспех. Аказваецца, мужчыны ў чырвоным успрымаюцца жанчынамі як больш прывабныя.

Да такой высновы прыйшла міжнародная каманда навукоўцаў, якая праводзіла псіхалагічныя тэсты. «Жанчыны надзяляюць мужчын у чырвоным больш высокім статусам, яны выклікаюць больш давер, бо здаецца, што гэтыя мужчыны паспяховыя і прыстойна зарабляюць», — каментуе кіраўнік праекта Эндру Эліёт з універсітэта Рочэстара (ЗША).

Падчас эксперыменту прадстаўніцам прыгожага полу дэманстравалі шмат фота сімпатычных мужчын і прасілі ацаніць мужчынскую прывабнасць. Першыя пазіцыі занялі мужчыны, адзетыя ў чырвоныя футболкі, або мужчыны, чые фота былі ўстаўленыя ў рамку чырвонага колеру.

Даследчыкі мяркуюць, што гэтую з'яву можна растлумачыць біялагічнымі прычынамі. У жывёльным царстве ў самцоў многіх відаў на грудзях ёсць заўважныя чырвоныя плямы. Чым інтэнсіўнейшая іх афарбоўка, тым больш поспеху яны маюць у самак.

Пунсовы — колер крыві. Пылкасць выклікае прыліў крыві да скуры.

Можна прыгадаць і старадаўні Рым. Там байцоў у элітныя часткі адбіралі, палохаючы хлопца зверам ці выпрабаваннем. Лічылася, што найлепшыя байцы выходзяць з тых, хто ад стрэсу чырванее, а не бялее.

**Сцяпан Батура**

# Блуза «Наша Ніва»? Стылёва!



Такую стылёвую блузу распрацавала і пашыла вядомая мадэльерка Святлана Длатоўская. Калі хто з чытачоў «Нашай Нівы» захоча пафарсіць у падобнай вопратцы, яе можна замовіць. Кантакт праз Рэдакцыю.

**Наталка Бабіна**

ІХ ПРАБЛЕМЫ

• **Самая маленькая кватэра ў свеце выстаўлена на продаж у Рыме.** Раней «апартаменты» плошчай 5 квадратных метраў былі гардэробнай лёкая. Цяпер іх прадаюць за 43 тысячы еўра. Кватэра размешчана на адной з маляўнічых плошчаў Рыма П'яцца ды Сант'Ін'яцыа, непадалёк ад катэджа Сільвіа Берлусконі. Хоць плошча кватэры і малая, у жытле ёсць ванна і спальня на другім ярусе. У кватэры, вядома ж, высокая столь.

• **У Расіі з'явіліся часопісы з пробнікамі піва.** Расійскае падраздзяленне піваварнага канцэрна SABMiller у рамках рэкламнай кампаніі піва Velkopopovicky Kozel змясціла пробнікі напою— светлага і цёмнага — у часопісе Maxim. Прапануецца, па чэшскай традыцыі, змешваць абодва гатункі.

• **Берлусконі на мыла — у прамым сэнсе.** У Цюрыху, сярод іншых экспанатаў выставы сучаснага мастацтва, знайшлося месца і для кавалка мыла. Называецца гэты твор «Чыстыя рукі». Калі верыць аўтару, Джані Моці, мыла зроблена з тлушчу прэм'ер-міністра Італіі Сільвіа Берлусконі. Тлушч мастак атрымаў у клініцы, дзе Берлусконі рабіў ліпасакцыю — выдаленне лішняга тлушчу.

**МБ**




## КАНЦЭРТЫ

**Публічнае вяселле ў «Рэактары»**

**24 кастрычніка ў клубе «Рэактар» (вул.Харужай, 29) а 18-й** — сумесны канцэрт гуртоў **Znich**, **«Рокаш»**, **«Сок»**, **«Рокерджокер»**, **«Змяя»**, **Unia** і інш, прысвечаны вяселлю саліста гурта Znich Алеся і Алесі Таболіч.

**Камерата**

**26 кастрычніка ў «Лісінай нары» (вул.Каліноўскага, 32) а 19-й** — канцэрт вакальнага ансамбля «Камерата».

**Крама**

**27 кастрычніка а 21-й у «Jack club» (вул.Няміга, 12)** — канцэрт гурта «Крама».

## ВЫСТАВЫ

**Юбілейная выстава Алеся Шатэрніка**

Выдатны беларускі скульптар, аўтар Звана Свабоды Алесь Шатэрнік святкуе сваё 70-годдзе 16 кастрычніка. Да гэтай нагоды **14-га ў Літаратурным музеі (вул. Багдановіча, 13)** адчыняецца ягоная юбілейная выстава «Сонцапрамень. Жывапіс. Скульптура. Імпрэсія».

**Смерць — гэта не правасуддзе**

**Да 11 снежня ў Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны** працуе выстава «Смерць — гэта не правасуддзе». Гэта выстава мае на мэце паказаць, што смяротнае пакаранне мусіць быць адменена.

**Выцінанкі Вячаслава Дубінкі**

**Да 24 кастрычніка ў музеі Максіма Багдановіча (вул.М.Багдановіча, 7а)** працуе выстава выцінанак Вячаслава Дубінкі «Я проста ў далёкай вандроўцы...», прысвечаная памяці знакамітага майстра. Выцінанкі Вячаслава Дубінкі шмат разоў экспанаваліся ў Беларусі і за мяжой, імі не раз ілюстраваліся кнігі. На іх аснове рэжысёр-мультыплікатар Міхась Тумеля здымае цыкл фільмаў «Беларускія прымаўкі».

**Гербарый часу**

**У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Незалежнасці, 47) да 30 кастрычніка** — выстава «Гербарый часу». Уваход зе гледачоў прапануюцца творы жывапісу і графікі маладых мастакоў: Таццяны Казанцавай, Ірыны Ясюкайць-Дударавай, Таццяны Грыневіч і Соф`і Піскун.

**Цень Ерусаліма**

**З 14 кастрычніка ў Гістарычным музеі** працуе фотавыстава Леаніда Падруля «Цень Ерусаліма». Мэта выставы, як прызнаецца сам мастак, — з дапамогай пейзажаў звярнуцца да ўнутранага свету чалавека, зацікавіць яго гісторыяй падзеяў, каторыя адбыліся ў біблейскія часы на зямлі Ізраіля і адбываюцца ў Ізраілі сучасным.

**Фатаграфіка**

**Да 15 кастрычніка на 4 паверсе Інстытута імя Гётэ (вул.В.Харужай, 25/3)** працуе выстава Ёрга Айднера «Фатаграфіка». Аснова творчасці Ёрга Айднера — здымкі ландшафтаў і графічная апрацоўка матываў. Уваход вольны.

**Караткевіч. Быў. Ёсць. Буду.**

**Да 25 кастрычніка ў Нацыянальным музеі літаратуры Украіны (Кіеў)** працуе літаратурна-мастацкая выстава «Уладзімір Караткевіч. Быў. Ёсць. Буду».

**Фатограф свайго часу**

**У Гістарычным музеі да 31 кастрычніка** працягваецца выстава «Фатограф свайго часу», прысвечаная 120-годдзю з дня нараджэння беларускага фотамайстра Ісака Салавейчыка. На выставе можна пабачыць арыгіналы і копіі фатаграфічных работ Ісака Салавейчыка — партрэты дзеячаў беларускай навукі і культуры, — створаныя ў перыяд 1952–1960 гг падчас ягонай працы ў газеце «Літаратура і мастацтва» і Дзяржаўным мастацкім музеі БССР.

**Джаз**

**У мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» (Кастрычніцкая пл., 1) да 2 лістапада** працуе выстава габеленаў Марыі Барысенка «Джаз». Прадстаўленая серыя габеленаў — гэта спроба мастака знайсці пластычнае выражэнне музыкі і эмоцый, якія ўзнікаюць пад яе ўздзеяннем.

**Тэхна-арт. Знак якасці**

**У мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» да 25 кастрычніка** працуе выстава «Тэхна-арт. Знак якасці», на якой прадстаўлена тэхна-мастацва выдатнай якасці: камп'ютарная анімацыя, лічбавае фота і мантаж...

## ІМПРЭЗЫ

**«Лёсы» Аляксандра Тамковіча**

**22 кастрычніка ў офісе Партыі БНФ** — прэзентацыя кнігі Аляксандра Тамковіча «Лёсы», прысвечанай лёсам слаўных людзей нашага часу. **Пачатак а 12-й.**

**«Верасень» у электрычнасці**

**13 кастрычніка ў фальварку «Добрыя мыслі» (вул.Магілёўская, 12) а 19-й** — новая праграма Вольгі Акуліч і гурта «Верасень» «у электрычнасці». Апроч музычнай часткі, наведнікаў фальварка «Добрыя мыслі» чакае і кінасюрпрыз — паказ кароткаметражных фільмаў Аляксея Марозава і Фёдара Немцава.

**Фестываль аматарскіх тэатраў «Дзверы»**

**З 13 да 15 кастрычніка ў Мінску** — фестываль аматарскіх тэатраў «Дзверы». Фестываль падтрымлівае ідэю «Не плаці!» — акторы не плацяць за ўдзел, гледачы — за ўваход. **13 кастрычніка на філалагічным факультэце БДУ ((вул.К.Маркса, 31) а 19-й** — «Прадавец тумакоў», «Пакаранне смерцю». **14 кастрычніка тамсама а 19-й** — «Спектакль такі й такі», «Страсці па Рабле». **15 кастрычніка у БДУІР (вул.Броўкі, 4) а 18-й** — «Акторы», «Развясёлыя нішчаброды, альбо Каханне і свабода».

## ТЭАТРЫ

**13 кастрычніка**

**Оперы і балета** — «Жызэль»
**Беларускай драматургіі** — «Вандроўнікі ў Нью-Ёрку»
**Імя Горкага** — «Жаніхі»
**Купалаўскі** (Малая сцэна) — «Старамодная камедыя»

**14 кастрычніка**

**Лялек** — «Пiпi-Доўгаяпанчоха»
**Імя Горкага** — «Васа»
**Оперы і балета** — «Рыгалета»
**Беларускай драматургіі** — «Вяртанне галадара»
**Оперы і балета** — «Жызэль»

**15 кастрычніка**

**Оперы і балета** — «Жызэль»
**Імя Горкага** — «Дзева і смерць»
**Беларускай драматургіі** — «Адвечная песня»
**Лялек** — «Гісторыя аднаго горада»

**16 кастрычніка**

**Лялек** — «Чароўная лямпа Аладзіна»
**Беларускай драматургіі** — «Воўк-мараплавец»
**Беларускай драматургіі** — «Містар Розыгрыш»
**Імя Горкага** — «Валянцінаў дзень»
**Оперы і балета** — «Чароўная флейта»

**17 кастрычніка**

**Лялек** — «Мыйдадзір»
**Оперы і балета** — «Тры парсючкі»
**Оперы і балета** — «Багема»
**Купалаўскі** — «Вячэра з прыдуркам»
**Імя Горкага** — «Даходнае месца»
**Беларускай драматургіі** — «Чорны квадрат»

**18 кастрычніка**

**Купалаўскі** (Малая сцэна) — «Зіма»
**Беларускай драматургіі** — «Мужчыны на мяжы нервовага зрыву»

**19 кастрычніка**

**Оперы і балета** — «Набука»
**Імя Горкага** — «Сыходзіў муж ад жонкі»
**Беларускай драматургіі** — «Жан і Беатрыса»

**20 кастрычніка**

**Оперы і балета** — «Набука»
**Імя Горкага** — «Анджэла і іншыя»
**Беларускай драматургіі** — «Палёты з анёлам»
**Купалаўскі** (Малая сцэна) — «Старамодная камедыя»

**21 кастрычніка**

**Оперы і балета** — вечар старадаўняга рамансa
**Купалаўскі** — «ГендэльБах»
**Імя Горкага** — «Праўда добра, а шчасце лепей»
**Беларускай драматургіі** — «Неба ў дыяментах»

**22 кастрычніка**

**Імя Горкага** — «Утаймаванне наравістай»
**Беларускай драматургіі** — «Сталіца Эраўнд»
**Оперы і балета** — «Расейскія сезоны XXI стагоддзя»
**Лялек** — «Дом, які збудаваў Свіфт»

**23 кастрычніка**

**Юнага гледача** — «Тры парсючкі»
**Лялек** — «Прыгоды Пін-Піна»
**Беларускай драматургіі** — «Адамавы жарты»
**Оперы і балета** — «Севільскі цырульнік»
**Імя Горкага** — «Эсфір»

**24 кастрычніка**

**Імя Горкага** — «Зорка сёмага неба»
**Юнага гледача** — «Бармалей»
**Лялек** — «Васіліса Прыўкрасная»
**Імя Горкага** — «Расейскія вадэвілі»
**Беларускай драматургіі** — «Дзеннік паэта (Інтымны дзённік)»




## КІНО

# Цёмныя гульні расейскіх ведзьмаў

**Цёмны свет** (Тёмный мир)
Расея, 2010, каляровы, 100 хв.
**Рэжысёр:** Антон Мегердзічаў
**Ролі выконваюць:** Іван Жыдкоў, Святлана Іванава, Уладзімір Носік, Сяргей Угрумаў, Алена Панова, Ілья Аляксееў, Марыя Кажэўнікава, Ксенія Радчанка, Захар Кунгурэеў
**Жанр:** Містыка, фэнтэзі
**Адзнака:** 3 (з 10)




Студэнты-філолагі ў пошуках фальклору забрылі ў глыбокія лясы і знайшлі муміфікаваную ведзьму. Самая цікаўная дакранулася да ведзьмы, і ў яе ўвайшла ведзьміна сіла. Цяпер на студэнтаў палюе чорны вядзьмар (і па сумяшчальніцтве міністр), які марыць ажывіць свайго гнюснага тату.

Стылем нагадвае «Начную варту».

У фільме ёсць паветраныя баі ведзьмаў і чарцей-спецназаўцаў, чорны дым, што трансфармуе целы, патапленне дзяўчыны, намёкі на сэкс, Баба Яга ў белай хламідзе і актор Уладзімір Носік у ролі прышыбленага прафесара філалогіі.

Усё гэта абцяжарана камп'ютарнымі эфектамі. І бяздушна.

**Андрэй Расінскі**




# Відэарадары выйшлі на паляванне

**З 9 кастрычніка штраф за перавышэнне хуткасці можна атрымаць па пошце.**



У жыцці беларускіх кіроўцаў пачалася новая эпоха. Цяпер ім варта прывыкаць да ўспышак аўтаматычных фота-відэарадараў, якія фіксуюць перавышэнне хуткасці, альбо перастаць парушаць правілы дарожнага руху. Згодна з прэзідэнцкім указам № 454 «Аб мерах, накіраваных на забеспячэнне бяспекі дарожнага руху з выкарыстаннем спецыяльных тэхнічных сродкаў» ад 3 верасня 2010, здымка, атрыманага з такога радара, дастаткова для вынясення штрафу. Указ прадугледжвае толькі мінімальны штраф як за першае, так і за паўторныя парушэнні. Напрыклад, за перавышэнне на 10—20 км/г прыйдзецца заплаціць 17 500 рублёў — палову базавай велічыні.

## Невінаваты я!

Пакуль што ўвага ДАІ скіраваная выключна на перавышэнне хуткасці. Іншыя парушэнні аўтаматыкай не вызначаюцца. Хоць у будучыні радары стануць «заўважаць» і праезд на чырвонае святло, і няслушную паркоўку, і выезды на сустрэчную паласу.

Найбольшы розгалас у грамадстве выклікаў той факт, што пры фіксацыі перавышэння хуткасці адміністратыўная адказнасць ускладаецца на ўласніка аўтамабіля. Няважна, ці знаходзіўся ён за стырном, менавіта яму давядзецца даказваць сваю невінаватасць і паказваць сапраўднага парушальніка. На гэтую працэдуру законам выдзяляецца месяц.

Цікава, што штраф давядзецца плаціць нават тым, хто не мае пасведчанняў кіроўцы — вобразна кажучы, бабульцы ў вёсцы, на якую запісаны «Лексус» унука.

Замежнікі столькі часу не атрымаюць. Па словах супрацоўнікаў ДАІ, інфармацыя пра парушальнікаў на аўтамабілі з небеларускімі нумарамі будзе аператыўна перадавацца на мяжу. Пакуль не заплаціць штраф — з краіны не выедзе.

Нягледзячы на новаўвядзенне, хуткасны рэжым ў Беларусі застаецца бадай што самым ліберальным у Еўропе. У абсалютнай большасці краін дазволены максімум у гарадах складае 50 км/г. У Беларусі ж — фактычна 69 км/г.

## Дзе камеры?

Паводле інфармацыі ДАІ, камеры на трасе «Мінск—Брэст» ужо працуюць, а вось у Мінску, хоць устаноўлена больш за 100 радараў, ніводны яшчэ не ўключаны. Яны пачнуць «выдаваць» штрафы толькі праз год.

Аўтамабілісты Беларусі падрыхтавалі карту 15 відэарадараў, усталяваных на трасе «Мінск—Брэст». Калі рухацца з боку Оршы, першая камера сустракаецца каля паварота на аэрапорт «Мінск-2». Другая — за 2 км да скрыжавання з гомельскай трасай. Наступная — адразу пасля аб'яднання трас Р1 і М1 каля Дзяржынска. Дарэчы, найбольшая колькасць камер знаходзіцца менавіта паміж Дзяржынскам і Стоўбцамі. Тут дазволеная хуткасць складае 100 км/г, а таму стаіць ажно пяць радараў. Яшчэ дзве камеры стаяць каля Баранавіч, адна каля Івацэвіч і адна — каля Бярозы. Другая скупнасць радараў назіраецца ў раёне Кобрына. Там якраз абмежаванне ў 120 км/г змяняецца на 90 км/г. Апошняя камера стаіць непадалёку ад Жабінкі, у вёсцы Хадасы. Далей шлях на Брэст вольны.

## На вёску дзядулю

Галоўнае пытанне, як перакласці адказнасць на іншага? Карыстальнікі інтэрнэту пачынаюць генерыраваць арыгінальныя ідэі.

Напрыклад, у прэзідэнцкім указе адзначана, што ўладальніку аўтамабіля дастаткова прадставіць дзве заявы, адну ад сябе і адну ад таго, хто знаходзіўся за стырном. З тэкстам накшталт «Я, грамадзянін Расіі Іван Іваноў, узяў аўтамабіль у свайго сябра». Тэарэтычна атрымліваецца, што тады ДАІ мусіць шукаць «парушальніка» ў суседняй краіне. Мякка кажучы, гэта складана, асабліва калі ніякага госця з Расіі не было, а заяву ад яго імя прыдумаў беларускі кіроўца.

Апісваецца і другая сітуацыя. Кіроўца з сябрамі метадычна катаўся з перавышэннем хуткасці міма камеры відэафіксацыі, каб хоць раз засвяціцца там. Штраф яму нястрашны, бо аўтамабіль усё яшчэ аформлены на дзядулю, які памёр некалькі гадоў таму. Няўжо аштрафуюць нябожчыка? — цікавіцца ўнук і чакае пастанову ДАІ.

**Працэдура вынясення штрафу ў Беларусі**

1) Радар вызначае нумар аўтамабіля.

2) ДАІ па базе дадзеных вызначае ўладальніка машыны.

3) На працягу трох дзён пастанова аб накладанні штрафу высылаецца заказным лістом.

4) Калі транспартны сродак належыць юрыдычнай асобе, яна на працягу пяці дзён павінна паведаміць імя кіроўцы, які знаходзіўся за стырном.

5) На працягу месяца кіроўца павінен аплаціць штраф альбо даказаць сваю невінаватасць, указаўшы на сапраўднага парушальніка.

**Што павінна быць у пастанове**

— Дата і месца складання пратакола

— Пасада і імя асобы, якая склала пратакол

— Звесткі пра асобу, якая прыцягваецца да адказнасці

— Час, месца і абставіны правапарушэння са спасылкай на парушаны артыкул

— Выява аўтамабіля ў момант правапарушэння

— Прынятае рашэнне

Зрэшты, хапае недасказанасцяў нават у прававым аспекце. Згодна з артыкулам 51 Канстытуцыі, любы чалавек мае права не сведчыць супраць сваіх сваякоў. Значыцца, і казаць, хто быў за стырном, неабавязкова.

## Няма твару — няма штрафу

Сістэма відэафіксацыі парушэнняў працуе шмат гадоў у еўрапейскіх краінах. Вось толькі працэдура выдачы штрафу адрозніваецца ад беларускай. Істотная ўмова — павінен быць бачны твар парушальніка. Гэты раздрукаваны здымак абавязкова адпраўляецца па пошце кіроўцу. І нават чалавека з суседняга крэсла зарэтушуюць. Калі здымак невыразны — гэта праблема мясцовай дзяржаўтаінспекцыі. Няма твару — няма штрафу.

**Яўген Васількоў**

## Кемікі



1) А і Б сядзелі на трубе. А ўпала, Б прапала, што засталося на трубе?

2) У двух шафёраў ёсць брат Сяргей, а ў Сяргея братоў няма. Ці можа такое быць?

**Сабрала Валянціна Карнялюк.**
**Адказы глядзі на старонцы 16.**

## Сапраўдная беларуская кухня

Восень... «Туман ярам, ярам-даліною...» — разам з восеньскімі туманамі павылазілі ў сухіх пясчаных барах грыбы-зялёнкі. Вы іх не пераблытаеце: радыкальна зялёныя, і растуць пад ігліцай ці ў радыкальным пяску.

Набраўшы, можаце замарынаваць іх такім чынам:

**Зялёнкі, соль, воцат, па 2 зярняты гваздзіку, чорнага перцу гарошкам, духмянага перцу, па 1 лаўровым лісце на кожны літровы слоік грыбоў.**

Зялёнкі заліць на 3--4 гадзіны моцна салёнай халоднай вадой для аддзялення пяску, добра памыць у некалькіх водах, давесці да кіпення, першую ваду зліць, зноў заліць халоднай вадой і варыць прыкладна 40 хвілін. Грыбы гатовыя, калі апусцяцца на дно. Пасаліць так, каб адвар быў моцна салёны (звычайна грыбы соляцца з разліку 1 сталовая лыжка буйной солі на 1 л адвараных грыбоў).

Прастэрылізаваць слоікі над парай. Слоік трэба трымаць над парай столькі, каб ён спачатку запацеў, а потым высах. Лепш выкарыстоўваць літровыя слоікі. Прастэрылізаваць крышкі, пракіпяціўшы іх.

На дно кожнага слоіка пакласці прыправы, уліць 1 сталовую лыжку воцату, запоўніць слоікі гарачымі грыбамі і закатаць. Захоўваць банкі ў прахалодным месцы.

Кансерваванне грыбоў на зіму — складаная задача. Калі недаліць воцату, ёсць небяспека развіцця ў слоіку смяротнага батулізму, які развіваецца без доступу кіслароду ў кансерваваных прадуктах. Калі пераліць, грыбы трацяць смак. Лепей ужываць марынаваныя грыбы свежымі, без закаткі.

**НБ (рэцэпт атрыманы ад Ганны Каракі)**

## Прыватныя абвесткі

### ЖЫТЛО

**Валька і Міхась** здымуць кватэру. Т.: (029) 690–92–56.

**Мяняю** 1–пакаёвую кватэру (17/30 кв.м, 4 паверх) у цэнтры Віцебска на любое жытло ў Мінску, можна непрыватызаванае. Т.: (029) 947–62–63.

### ЗАНЯТКІ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

**Запрашаю** на заняткі дзяцей, падлеткаў, моладзь. У праграме: мастацкае выплятанне з саломы, маляваныя дываны, папярапластыка (выцінанка, бібулкарства), маляванне на шкле, тэкстыльны дызайн (праца з лямцам, тканне пасаў) і яшчэ шмат–шмат чаго цікавага. Заняткі ў Доме творчасці моладзі, бясплатныя. Т.: (029) 312–54–71. Валянціна Лойка.

### КАНТАКТЫ

**Шукаю** тых, хто цікавіцца Партугаліяй, Бразіліяй, Анголай, Мазамбікам, іншымі партугаламоўнымі краінамі. Т.: 267–80–52, (029) 702–03–23.

### КНІГІ

**Выйшла кніга «страдацельных» песень** «Жорсткі раманс» (недаследаваны жанр у беларускай фалькларыстыцы). 435 старонак. Жадаючым набыць: (029) 672–03–75.

**Прадам нядорага** метадычную літаратуру для настаўнікаў беларускай мовы. Т: (029) 276–15–98.

**Маст. фільм** «Беларуская быль» (Номфільм, 2006) на DVD прадам. Т.: (029) 332–69–56, Святлана.

**Прадаю Біблію** за 5000 рублёў. Т.: 8–0212–25–80–79.

### ПАСТУПЛЕННЕ

**Навучаю выяўленчаму мастацтву**, рыхтую да паступлення ў мастацкія навучальныя ўстановы. Т.: 306–33–17, (029) 551–32–36.

**Фізіка. Матэматыка.** Падрыхтоўка да тэставання, дапамога школьнікам. Т.: (029) 560–31–89.

### ПАДЗЯКІ

**Дзякуй сябрам з Бельгіі** за падтрымку ў цяжкі для мяне час! Дзякуй сябрам БХД за дапамогу і падтрымку! Дзякуй жонцы Алене, якая ўсё яшчэ трымаецца! І, галоўнае, дзякуй Богу! Кастусь Жукоўскі.

### ЧАС ЗРАБІЦЬ ПРАВІЛЬНЫ ВЫБАР

**Сабака прывяла 4 шчанятак.** Сама прыгожая, разумная, без дрэнных звычак. Сабачка, з якім злучылася, — пародзісты і сімпатычны. Сабачкі вызначаюцца адданасцю гаспадару, выхаванасцю, прыстойнасцю, не брэшуць, як некаторыя двухногія істоты, шмат абяцаючыя, але мала робячыя для людзей добра. Грамадзяне! Час зрабіць правільны выбар. Для беларускамоўных пры куплі прадбачваюцца істотныя зніжкі. Т.: 288–05–44, (029) 185–66–06.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e–mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

# Падарункі Пуціну: і ню, і заклеены рот

У Расіі ўспыхнуў скандал. Выпускніцы факультэта журналістыкі МДУ імя Ламаносава падрыхтавалі ў падарунак прэм'ер-міністру Расіі Уладзіміру Пуціну, якому 7 кастрычніка споўнілася 58 гадоў, эратычны каляндар.

На яго старонках журналісткі пазуюць у бялізне і прызнаюцца ў каханні да Пуціна.

Кіраўніцтва ўніверсітэта асудзіла гэты крок, а шэраг яго цяперашніх студэнтак падрыхтавалі альтэрнатыўны каляндар. У ім таксама выявы студэнтак журфака МДУ, але не аголеных і не ў зазыўных позах, а ў чорных сукенках ці паліто і з залепленымі скотчам вуснамі. Дзяўчаты адрасавалі прэм'еру ў дзень яго нараджэння няўзручныя пытанні. «Калі вызваляць Хадаркоўскага?», «Хто забіў Ганну Паліткоўскую?» і г.д. Дарэчы, 7 кастрычніка — гэта не толькі дзень нараджэння Пуціна, але і дзень гібелі аглядальніцы «Новой Газеты».

Інтэрнаўты адрэагавалі на скандал жартамі. Не адсталі і беларусы. Так, блогер zhelezko, спасылаючыся на ананімную «крыніцу з Цэнтральнага апарату БРСМ», паведаміў, што першымі ідэю з паўаголенымі студэнткамі выкарысталі сябры БРСМ, падрыхтаваўшы летась адмысловы каляндар да юбілею Лукашэнкі. Блогер выклаў і апрацаванае ў фоташопе правакацыйнае фота дзяўчыны. Таму неўзабаве з'явілася новае: на ім выяўлены Мядзведзеў і Пуцін, якія пытаюць: «Аляксандр Рыгоравіч, ну а хто, калі не вы?»

**Сямён Печанко**








NAVINY.BY

Срэбны прызёр Алімпіяды ў Пекіне ў кіданні молата Вадзім Дзевятоўскі ажаніўся. Яго абранніцу зваць Вольга, па адукацыі яна юрыст. Вяселле адкладалася з-за судоў з дысцыплінарнай камісіяй Міжнароднага алімпійскага камітэта за медалі. Вянчаліся маладыя ў Полацкай Сафіі.


СЯМЁН ПЕЧАНКО

**Патрыятызм не ведае межаў: у продажы з'явілася бялізна з афіцыйнай сімволікай. Патрыятычныя майткі для мужчынаў выпускае ААТ «Марк Фармэль».**



SVABODA.ORG

## Анекдоты

* * *

Жанчына падыходзіць да прадстаўнікоў перадвыбарчага стэнда.

— Хлопцы, не скажаце, як даехаць да Камароўкі?

Хлопец з пікета:

— Наш кандыдат трымаецца такой пазіцыі: вам трэба сесці на трамвай нумар 8 і пад'ехаць два прыпынкі да плошчы Якуба Коласа.

* * *

У Маскве ў 2011 годзе знясуць помнік Пятру I. У Мінску на гэты год запланаваны знос Лядовых палацаў і Нацыянальнай бібліятэкі.

* * *

Парада дзяўчатам. Не варта давяраць мужчыну, які сцвярджае, што не жанаты, калі вы ў яго ў тэлефоне запісаная пад імем Водаканал.

* * *

Паводле апошніх звестак, рыбны абоз, з якім выправіўся па навуку ў Маскву Міхайла Ламаносаў, бацька даў яму на хабары.

* * *

Да другой хвалі фінансавага крызісу гатовыя! Медны тазік начышчаны.

* * *

Самы страшны кашмар: зрабіць бутэрброды, наліць гарбаты, прынесці ўсё гэта ў ложак, закруціцца ў коўдру і забыцца пульт ад тэлевізара...

## «НН» сто гадоў з вамі

**Нядаўна на станцыі Вільня цягнік пераехаў старца, каторы ішоў рэйкамі.** Калі яго даставілі ў бальніцу, то дазналіся, што гэта былы ковенскі гарадскі галава. Ён збяднеў і, не маючы з чаго жыць, на сёмым дзясятку свайго жыцця пайшоў жабраваць.

**«НН». №39. 1910.**

**Беларусь штогод бясплатна аказвае Расіі паслугі на суму 850 млн даляраў ЗША, заявіў А.Лукашэнка.** Гэтая сума ўлучае «базы, транзіт і іншыя паслугі», якія беларускі бок робіць Расіі. Так, 200 млн даляраў мела б каштаваць выкарыстанне Расіяй станцыі папярэджання аб ракетным нападзе ў Ганцавічах, якая па важнасці, на думку Лукашэнкі, не саступае Байкануру. «Але мы гэтую бухгалтэрыю як братнія дзяржавы не выпінаем», — заўважыў А.Лукашэнка.

**«НН». № 42.2000.**

**Адказы да старонкі 15:**
1) Лігра «ів». 2) Можа, калі шафёры — сёстры.

Наша Ніва
незалежная газета
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).
сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф-рэдактар Андрэй Дынько
галоўны рэдактар Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.
**Наклад 6410.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 12.10.2010.
Замова № 4992.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
M 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614